Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 САКАВІКА 2017 г. СЕРАДА № 41 (28405)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Вуліца-прывід

МС



Затрымаць моладзь пасля размеркавання

МС



Як змагаюцца з адходамі

МС

## ЛІЧБА ДНЯ

**9 504,7 тыс. чалавек**

*склала колькасць насельніцтва Беларусі на 1 студзеня гэтага года. У апошнія гады колькасць насельніцтва рэспублікі расце. Так, на 1 студзеня 2015 года было 9 481 тысяча, на 1 студзеня 2016 года — 9 498 тыс. чалавек. Колькасць жыхароў Мінска дасягнула на 1 студзеня 2017 года 1 974,8 тыс. На другім месцы па колькасці насельніцтва — Мінская вобласць (1 423 тыс.). Сярод рэгіёнаў краіны менш за ўсё жыхароў налічваецца ў Гродзенскай вобласці — 1 047,5 тыс. чалавек. Па папярэдніх даных, у Беларусі на 1 студзеня гэтага года пражывалі 4 427 тыс. мужчын і 5 078 тыс. жанчын. У краіне працягваецца працэс урбанізацыі: удзельная вага гарадскога насельніцтва павялічылася за мінулы год з 77,6% да 77,9%.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8859 | ▲ |
| Еўра | 1,9973 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0693 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ВЯСНЕ — ДАРОГУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Ганна БАРКУН з сынамі Андрэем і Мацвеем (у калясцы) засвойваюць азы язды на ролікавых каньках.

Ідэя+

*Новы, сумесны праект «Звязды» і камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама прысвечаны Году навукі. Яго мэта — прасачыць, як на справе ўкараняюцца ў вытворчасць перадавыя ідэі. У яго рамках мы сустрэнемся з вучонымі, таленавітымі кіраўнікамі, адоранымі рацыяналізатарамі, генератарамі ідэй, усімі тымі, дзякуючы каму наша жыццё становіцца больш камфортным і мабільным. Разам з намі вы даведаецеся, як цікавыя праекты нараджаюцца ў светлых галовах нашых суайчыннікаў і што робіцца для таго, каб яны пачалі працаваць на карысць чалавецтва. Магчыма, чыесьці прыклады натхняць і нашых чытачоў. Хто ведае, можа ўнутры вас таксама дрэмле геній, якога толькі трэба разбудзіць?*

## УЗНАГАРОДА ЗА КРЭАТЫЎНАСЦЬ

### Мясцовы інавацыйны фонд фінансуе новае і карыснае

**Нават самыя лепшыя інавацыйныя праекты могуць застацца на паперы, калі не знайсці на іх сродкі. Вядома, што самі па сабе грошы на галаву не зваляцца, трэба вучыцца іх шукаць. Спонсары, гранты, іншая дапамога — спосабаў шмат. Дзяржава не выключэнне. Яна таксама заахвочвае прадпрыемствы і бізнес, каб яны былі ініцыятыўнымі. Пры аблвыканкамах створаны інавацыйныя фонды, якія могуць прафінансаваць крэатыўную ідэю. Як дзейнічае гэты механізм, мы спыталі ў старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Руслана СТРАХАРА.**



— Само паняцце інавацыйны фонд існуе ў Беларусі даўно, але пераломным момантам стаў Указ №357 ад 7 жніўня 2012 года «Аб парадку фарміравання і выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў». Ён канкрэтна абазначыў, для якіх праектаў вылучаюцца сродкі, якім крытэрыям павінны адпавядаць праекты, размяшчаў паняцці мясцовых інавацыйных фондаў і рэспубліканскіх, — кажа Руслан Страхар.

СТАР. 4

■ Ліст у нумар

## І БЕЗ ГРОШАЙ БЯДА, І З... ГРАШЫМА?

**Як пераадолець бар'еры ў нашай свядомасці і ў нашым жыцці**

Выпісваць газету «Звязда» пачаў яшчэ мой бацька Іван Хартонавіч Кароткі. А вось піша вам яго сын, інвалід І групы з дзяцінства. Што прымусіла? Як вы, напэўна, здагадаліся, крыўда.

Некалі за свае ўласныя грошы я купіў аўтамабіль «Ака» з ручным кіраваннем. Наколькі ён мне патрэбен, расказваць не буду, бо гэта зразумела і так. Скажу толькі, што гэтай машыне, як і ўсякай іншай, патрэбен догляд, а час ад часу — і нейкі рамонт. На чарговы я патрацію пэўную суму грошай, патрацію смела, бо меў надзею, што на спраўнай машыне ў любы час змагу пад'ехаць у ашчадны банк і зняць там працэнты па ўкладзе.

Каб зрабіць гэта, сёлета, 30 студзеня, удваіх з сацыяльнай работніцай мы дабраліся да гарадскога пасёлка Капаткевічы, да ашчаднага банка. А вось далей...

Высветлілася, што выйсці з машыны я там проста не магу: лёд, хіба дзеля адчэпнага, ледзь-ледзь і месцамі пасыпаны пяском.

У выніку сацыяльны работнік пайшла ў касу з маімі дакументамі, але без мяне. Пайшла і амаль адразу вярнулася: сказала, што грошай ёй не даюць, што іх можа атрымаць толькі сам укладчык.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Заўважыць і заахвоціць

## На ўсе карысныя для краіны распрацоўкі і дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр трансплантацыі органаў і тканак 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з распрацоўкамі, вылучанымі ў 2016 годзе на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі.**


Фота БЕЛТА.

«Трэба паглядзець на ўсіх распрацоўшчыкаў, мы павінны на іх звярнуць сур'ёзную ўвагу. Калі мы не змаглі ім прысвоіць лаўрэатаў дзяржаўнай прэміі, адбярыце гэтыя работы (калі відаць, што эфект каласальны і яна заслугоўвае, прынамсі, увагі), падумайце і ўнясіце мне прапановы, што мы будзем рабіць з гэтымі людзьмі і работамі. Так, усе не павінны дзяржпрэміі атрымліваць, таму што гэта ўжо будзе абязлічванне. Але яны заслугоўваюць іншага заахвочвання», — заўважыў кіраўнік дзяржавы, даручыўшы таксама Адміністрацыі Прэзідэнта прааналізаваць, які эканамічны эфект для краіны прынеслі навуковыя работы, што атрымалі дзяржаўныя прэміі ў папярэднія гады.

Аляксандр Лукашэнка падрабязна азнаёміўся з кожнай работай, якая была вылучана ў 2016 годзе на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі, паведамляе БЕЛТА. Гэта былі распрацоўкі і праекты ў сферы трансплантацыі органаў, прамысловасці, машынабудавання, сельскай гаспадаркі, нафтаздабычы, будаўніцтва, тэхналогій і гісторыі.

Многія з іх сталі добрым прыкладам імпартазамяшчэння. Напрыклад, калектыў аўтараў з Нацыянальнай акадэміі навук стварыў банк генетычных рэсурсаў сельскагаспадарчых і лясных раслін для забеспячэння харчовай і біялагічнай бяспекі краіны. Дзякуючы ім цяпер у Беларусі можна будзе вырошчваць гарчыцу, гэта дасць магчымасць прадпрыемствам не імпартаваць яе насенне з-за мяжы для вытворчасці прыправы.

Супрацоўнікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта распрацавалі эфектыўную металічную структурную канструкцыю, якая выкарыстоўвалася пры будаўніцтве Летняга амфітэатра ў Віцебску, стадыёна «Спартак» у Магілёве, будынка Нацыянальнага алімпійскага камітэта і «Мінск-Арэны», а таксама іншых аб'ектаў. Нядаўна беларускія спецыялісты спраектавалі пакрыццё (дах у выглядзе купала) для будынка Трэцякоўскай галерэі.

Прэзідэнт зацікавіўся цыклам навуковых работ «Вытокі беларускай дзяржаўнасці: Полацкая і Віцебская землі ў IX—XVIII стагоддзях». Праведзеныя даследаванні паказалі, што беларуская дзяржаўнасць пачала фарміравацца ў сярэдзіне IX стагоддзя — са стварэннем Полацкай зямлі. Станаўленне Полацка ў якасці цэнтра гэтага дзяржаўнага ўтварэння ажыццяўлялася на мясцовай племянной аснове, у той час як у Ноўгарадзе і Кіеве для гэтага запрашалі варагаў. Нават пазней Полацкія землі, увайшоўшы ў склад Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, развіваліся аўтаномна.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што сёння ідзе праца над новымі падручнікамі і гэтыя моманты станаўлення беларускай дзяржавы ў іх абавязкова трэба адлюстраваць. «Трэба прапісаць і ўкараніць у розумы нашых людзей праўду, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Тут калі і ёсць нейкі нацыяналізм, то гэта нацыяналізм здаровы».

Кіраўнік дзяржавы таксама правёў паралель з сучаснасцю. «Мы сапраўды сябе стварылі, і з намі лічыліся тады. Усё гэта сугучна і актуальна цяпер, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Сёння некаторыя пад выглядам «дармаедства», яшчэ чагосьці спрабуюць гэтую лодку разгайдаць і даказаць нам, што гэта не нашы землі, а чыесьці. Таму для нас гэта вельмі актуальна. «Дармаеды» павінны ведаць, што іх проста спрабуюць сёння выкарыстоўваць у самых карыслівых мэтах, каб разбурыць тое, што ёсць, знішчыць на корані тое, што мы адрадзілі, каб не даць нам замацавацца».

Падчас наведвання РНПЦ Прэзідэнт азнаёміўся з работай цэнтра, пагутарыў з пацыентамі і даручыў прапрацаваць пытанне аб мэтазгоднасці стварэння ў Беларусі асобнага новага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак (сёння ўстанова функцыянуе на базе 9-й клінічнай бальніцы Мінска). Работа па распрацоўцы і ўкараненні тэхналогій трансплантацыі органаў у дзяцей і дарослых у 2016 годзе вылучана на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі.

# Менш валакіты, больш магчымасцяў

**У краіне ўдасканальваецца парадак стварэння і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання. На гэта накіраваны Дэкрэт №2 ад 28 лютага 2017 года, якім уносяцца змяненні ў Дэкрэт №1 ад 16 студзеня 2009 года «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», паведаміў у прэс-службе беларускага лідара.**

У мэтах скарачэння адміністрацыйных працэдур і паскарэння пачатку ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці дэкрэтам прадугледжана магчымасць адкрыцця банкаўскага разліковага рахунку адначасова з рэгістрацыяй суб'екта гаспадарання на падставе прадстаўлення рэгіструючага органа.

Для паляпшэння інвестыцыйнага клімату і адмены залішніх абмежаванняў па ўдзеле юрыдычных і фізічных асоб у стварэнні новых суб'ектаў гаспадарання дэкрэтам выключаецца абмежаванне па стварэнні даччынага прадпрыемства ў выпадку наяўнасці ў яго заснавальніка не выкананых у тэрмін грамадзянска-прававых абавязацельстваў.

Змяняецца падыход да працэдуры прызнання дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання несапраўднай пры прадстаўленні імі ў рэгіструючы орган звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці. Пры разглядзе гэтай катэгорыі спраў судамі падлягаюць уліку характар допушчаных парушэнняў, наяўнасць урону і іншыя абставіны, якія маюць значэнне для справы.

Рэгіструючыя органы надзяляюцца правам на ліквідацыю суб'екта гаспадарання, які не ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць на працягу 24 месяцаў запар. Цяпер такое рашэнне прымаецца пры неажыццяўленні названай дзейнасці на працягу 12 месяцаў запар і пры ўмове ненакіравання паведамлення аб прычынах яе неажыццяўлення.

Пры гэтым дэкрэтам трохгадовым тэрмінам абмяжоўваецца права падатковых і іншых упаўнаважаных органаў на зварот у суд з іскам аб прызнанні дзяржаўнай рэгістрацыі суб'екта гаспадарання несапраўднай, іх ліквідацыі (спыненні дзейнасці), а таксама права суб'ектаў гаспадарання на абскарджанне дзеянняў (бяздзейнасці) рэгіструючых органаў.

Згодна з палажэннямі дэкрэта суб'ект гаспадарання, які прыняў рашэнне аб самаліквідацыі, мае права для праверкі правільнасці вылічэння, своечасовасці і паўнаты выплаты абавязковых плацяжоў у бюджэт заключыць дагавор аказання аўдытарскіх паслуг. Наяўнасць аўдытарскага заключэння і справаздачы дасць магчымасць падатковым і мытным органам, Белдзяржстраху прадставіць рэгіструючаму органу неабходныя для ліквідацыі суб'екта гаспадарання даведкі або звесткі без правядзення яго дадатковых праверак.

Дэкрэтам таксама замацоўваецца магчымасць падачы суб'ектамі гаспадарання дакументаў аб ліквідацыі (спыненні дзейнасці) у электронным выглядзе і вызначаецца механізм прыпынення дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў у сувязі з праходжаннем імі тэрміновай ваеннай або альтэрнатыўнай службы, знаходжаннем ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы.

Дэкрэт, за выключэннем яго асобных палажэнняў, уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

## Парламенцкі дзённік

# ІМІДЖ КРАІНЫ

**26-я штогадовая сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску — выключна важнае палітычнае мерапрыемства. Пакуль што за ўвесь перыяд нашай незалежнасці ў Беларусі такіх падзей не было. Але прыйшоў час — і гэтым летам да нас завітаюць прадстаўнікі амаль 60 краін — членаў асамблеі. А гэта, па папярэдніх разліках, — амаль 600 чалавек.**

Падчас зімовага пасяджэння ПА АБСЕ, што адбылося на мінулым тыдні, наша дэлегацыя сустрэлася з кіраўніцтвам арганізацыі і абмеркавала правядзенне 26-й штогадовай сесіі.

— Я далажыў, што ў нас створаны аргкамітэт, падпісана распараджэнне кіраўніка дзяржавы па гэтай тэме, — паведаміў **віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Валянцін ПІРШТУК**, які ўзначальваў беларускую дэлегацыю ў Вене. — Нашу краіну двойчы наведваў міжнародны сакратарыят, мы вызначылі фармат таго мерапрыемства, якое будзе праходзіць у Мінску. Кіраўніцтва ПА АБСЕ было задаволена гэтай інфармацыяй. Мы чакаем 15—17 сакавіка кіраўнікоў ПА АБСЕ да нас з двухдзённым візітам.

Стаўленне да Беларусі, да нашых парламентарыяў было цёплым. Гэтым разам, адзначаюць нашы дэпутаты, на пасяджэнні Парламенцкай асамблеі ў адрас Рэспублікі Беларусь увогуле не гучала ніякай крытыкі. Амаль усе парламентарыі праявілі цікавасць да беларускага стэнда.

— У першы дзень, калі мы пачалі працу, практычна за першую палову дня былі разабраны карты беларускай сталіцы, магніты, лістоўкі, — адзначыў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — Дэпутаты другіх краін вельмі цікавіліся, падыходзілі і ўдакладнялі нюансы. Мы, такім чынам, робім вывад, што пераважная большасць дэпутатаў ПА АБСЕ з велізарнай цікавасцю чакаюць сустрэчы ў Беларусі. Для нас вельмі важна, каб гэтае мерапрыемства прайшло на добрым узроўні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Наша пазіцыя

# НЕЛЬГА ІГНАРАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ

**У гэтую нядзелю ў Гайнаўцы (Польшча) адбыўся марш памяці гэтак званых «праклятых салдат», якія ў свой час забілі многіх этнічных беларусаў. Андрэй НАУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Польшчы, падкрэсліў у каментарыі газеце «Звязда», што такі марш увогуле непрымальны.**

— У Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь з вялікім шкадаваннем успрынялі навіны аб паўторным правядзенні ў польскім горадзе Гайнаўка праварадыкальнага маршу з мэтай герaізацыі асобных дзеячаў польскага падполля 1940—1950-х гадоў, вядомых як «праклятыя салдаты», — адзначыў парламентарый. — Нельга ігнараваць гістарычную праўду аб тым, што на сумленні некаторых з гэтых дзеячаў — дзясяткі мірных жыхароў Падляшша, якія былі знішчаны толькі таму, што належалі да беларускага этнасу. У прыватнасці, мяркую не лішнім нагадаць, што адзін з такіх «палявых камандзіраў» — Рамуальд Райс па мянушцы Буры — аддаў загад аб знішчэнні 60 беларускіх вёсак, у тым ліку аб спальванні жывымі жыхароў вёскі Залешаны. Хачу нагадаць, што органамі судовай улады Рэспублікі Польшча дзеянні Р. Райса былі афіцыйна прызнаны генацыдам.

Правядзенне маршу, які ўсхваляе падобных ваенных злачынцаў, у Гайнаўцы — горадзе з беларускай этнічнай большасцю — з'яўляецца, на маю думку, цынічнай правакацыяй, накіраванай на штучнае распальванне варожасці паміж беларусамі і палякамі, нагнятанне напружанасці на нацыянальнай і канфесіянальнай падставе.

Разумеючы, што гэта мерапрыемства праходзіць насуперак меркаванню афіцыйных улад Рэспублікі Польшча, заклікаю польскіх калег-парламентарыяў да катэгарычнага асуджэння падобных правакацый і процідзеяння ім у далейшым.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Японіі шукаюць назву эры праўлення новага імператара

У Японіі паралельна выкарыстоўваюцца дзве сістэмы летазлічэння — еўрапейская і ўласная, па гадах праўлення манархаў. Апошняя ўжываецца ў краіне па меншай меры з VII стагоддзя. Бягучы год, напрыклад, адначасова лічыцца 2017-м і «29-м годам Хэйсэй», як называецца эра царавання цяперашняга імператара Акіхіта, які ўступіў на трон у 1989 годзе. Згодна з заканадаўствам, манарх знаходзіцца на троне пажыццёва, яго адрачэнне не прадугледжваецца. Аднак летам мінулага года Акіхіта публічна даў зразумець, што мае намер датэрмінова пайсці на спачынак з-за сталага ўзросту.

Паводле неафіцыйных звестак, Акіхіта, хутчэй за ўсё, сыдзе ў канцы гэтага года, магчыма, 31 снежня. Прынц Нарухіта ў такім выпадку стане імператарам 1 студзеня 2018 года. Тады ж афіцыйна пачнецца і эра яго царавання з адпаведнай назвай.

### Трамп паставіў сабе за работу на пасадзе прэзідэнта ацэнку «пяць з плюсам»

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп ацаніў сваю працу на вышэйшай дзяржаўнай пасадзе на «пяць з плюсам», а ўменне мець зносіны з грамадзянамі краіны — толькі на «тройку». Вынікі першых пяці тыдняў свайго знаходжання ў Белым доме ён падвёў у інтэрв'ю тэлекампаніі Fox News.



Адказваючы на просьбу журналістаў паставіць сабе адзнаку за работу на пасадзе прэзідэнта, Трамп без бесцырымоннасці заявіў, што заслугоўвае «пяцёркі з плюсам». У той жа час ён па ўласнай ініцыятыве прызнаў, што за зносіны з суайчыннікамі яму варта паставіць толькі «тройку з плюсам». «У нас выдатна працуе ўрад, але мы пакуль не змаглі растлумачыць гэта амерыканцам», — сцвярджаў Трамп.

Ён выказаў надзею, што здолее неяк выправіць сітуацыю, калі выступіць з пасланнем «Аб становішчы краіны» на сумесным пасяджэнні абедзвюх палат Кангрэса ЗША.

### Масква адмовілася затрымаць падазраваных у забойстве Кім Чэн Нама

Паўднёвая Карэя прасіла Расію затрымаць чатырох паўночнакарэйцаў, якія падазраюцца ў забойстве ў Куала-Лумпуры Кім Чэн Нама — брата лідара КНДР Кім Чэн Ына, аднак Масква не пайшла на гэты крок з-за адсутнасці дастатковых падстаў. Пра гэта паведамляе паўднёвакарэйская газета «Чунан ільба» са спасылкай на дыпламатычную крыніцу.

Па звестках выдання, спецслужбы Паўднёвай Карэі, спрабуючы адрэзаць меркаваным злачынцам шлях да ўцёкаў у Пхеньян, звярнуліся да ўлад Расійскай Федэрацыі з просьбай выявіць іх месцазнаходжанне і затрымаць з мэтай праверкі. «Але расійскі бок адхіліў запыт, дазволіўшы ім пакінуць краіну», — сцвярджае газета.

■ Падрабязнасці

# Квадракоптар, маштабная сістэма відэаназірання і паліграф

### Як мадэрнізуецца міліцэйскае ведамства

**Напярэдадні стагадовага юбілею беларускай міліцыі, які будзе адзначацца 4 сакавіка, міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ правёў вялікую прэс-канферэнцыю. Сярод асноўных пытанняў — аптымізацыя асабовага складу ведамства і актыўнае ўкараненне ў яго работу сучасных тэхналогій.**

Міністр падкрэсліў, што афіцэрскі корпус органаў унутраных спраў павінен быць больш кампактным, прафесійным і універсальным. Частка работы, якую могуць выконваць грамадзянскія асобы, а не людзі ў пагонах, будзе пераходзіць да іх, але ў цэлым аптымізацыя закране ўсе міліцэйскія службы. Скарачэнні будуць праходзіць паступова, у ахвотных будзе магчымасць дапрацаваць да пенсіі, але пасля іх сышоу некаторыя пасады будуць ліквідавацца. Да аптымізацыі колькасці служачых падштурхоўвае і навукова-тэхнічны прагрэс. Напрыклад, з некаторымі абавязкамі супрацоўнікаў ДАІ выдатна спраўляюцца аўтаматычныя радары. Цяпер распрацоўваецца праект укаранення адзінай сістэмы відэафіксацыі і маніторынгу грамадскай бяспекі. Паўсюдна ўстаноўленыя камеры змогуць, напрыклад, аўтаматычна ідэнтыфікаваць асобу злачынца, які знаходзіцца ў вышуку, або паведамляць пра пакінуты без нагляду прадмет. Супрацоўніцтва з МНС дазволіць прадухіляць і надзвычайныя сітуацыі.

У найбліжэйшых планах ведамства — увядзенне ў работу квадракоптараў, якія змогуць істотна палегчыць працэс пошуку зніклых у лесе. Што датычыцца тэхналогіі паліграфа, або, прасцей кажучы, дэтэктара лжы, Ігар Шуневіч падкрэсліў, што для ведамства яна далёка не новая і раней выкарыстоўвалася для праверкі супрацоўнікаў, цяпер жа гэта сталі рабіць у разы часцей.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Занятасць

# Самыя працавітыя — 40-гадовыя

**Нацыянальны статыстычны камітэт правёў выбарачнае даследаванне дамашніх гаспадарак. Вынікі паказалі, што фактычны ўзровень беспрацоўя за мінулы год склаў 5,8 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва.**

На канец студзеня 2017 года ў краіне было зарэгістравана 39,9 тысячы грамадзян без работы. Дзве трэціны з іх — мужчыны. Амаль чвэрць — асобы ва ўзросце да 30 гадоў. Вясковы ўзровень беспрацоўя — звыш сярэдняга... Сярод беспрацоўных налічвалася каля 16 працэнтаў. У агульнай колькасці незанятых беларусаў 29 працэнтаў складаюць тыя, хто сышоў з прадпрыемства па ўласным жаданні і пагадненні бакоў, амаль 4 працэнты — звольненыя за парушэнне працоўнай дысцыпліны, 2,4 працэнта — вызваленыя пры ліквідацыі арганізацыі ці скарачэнні колькасці. Узровень занятасці насельніцтва за мінулы год — 66,7 працэнта (у 2015-м гэты паказчык быў 68,1 працэнта). У працаздольным узросце (мужчыны — 16—59 гадоў, жанчыны — 16—54) узровень занятасці склаў амаль 81 працэнт. Максімальная доля працуючых (90 працэнтаў) налічвалася ва ўзроставай групе 40—44 гады.

Усяго ў эканоміцы Беларусі на пачатак 2017 года было занята 4 мільёны 367 тысяч чалавек.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Здарэнне

# Арсенал зброі ў кватэры

**Яго выявілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку Савецкага РУУС г. Мінска пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз». 46-гадовы мужчына незаконна захоўваў дома арсенал зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Нідзе не працуючы раней не судзімы грамадзянін захоўваў такую не колькасць, што можна было ўзброіць невялікае падраздзяленне. Так, падчас агляду ў кватэры аператыўнікі знайшлі: пісталеты-кулямёты ППС, ППШ, Томсана, вінтоўку СВТ, наган, рэвальверы, клінок, кінжал, боепрыпасы, а таксама часткі зброі. Пры затрыманні зламыснік праз акно выкінуў адзін з пісталетаў — браўнінг. Апроч таго, праваахоўнікі знайшлі форму нямецкіх афіцэраў. Як патлумачыў мужчына, усё гэта ён калекцыяніраваў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*







guvd.gov.by

■ Тры пытанні да ўлады

# Наша фішка — гэта ўнікальная экалогія і ініцыятыўныя людзі

**Сёлета Клічаў стане сталіцай «Дажынак» Магілёўскай вобласці. Тут адрамантуюць вуліцы і аб'екты сацкультбыту, навядуць парадак у жылым сектары, больш утульнымі зробяць зялёныя куточкі горада. Ужо летась пачалася падрыхтоўка ўязных трас у горад, быў зроблены капітальны рамонт аўтамабільнага мосту цераз Ольсу. Але асноўныя работы яшчэ наперадзе. Пра тое, як ідзе падрыхтоўка да аграрнага свята і чым наогул жыве раён, расказвае старшыня Клічаўскага райвыканкама Францішак ВАШЧЫЛА.**



***— Францішак Вітольдавіч, наколькі сур'ёзныя перамены адбудуцца ў знешнім выглядзе горада напярэдадні «Дажынак»?***

— Перш за ўсё зменяцца цэнтральная плошча, дзе разгорнуцца асноўныя падзеі гэтага фестывалю, і гарадскі парк. На плошчы мы збіраемся стварыць прыгожы горадабудаўнічы ансамбль, рэканструяваць будынкі раённага Дома культуры і дзіцячай школы мастацтваў, якія прымыкаюць да яе. На самой плошчы будзе пакладзена каляровая плітка, разбіты газоны. На рэканструкцыю Дома культуры пойдзе больш за мільён новых рублёў. Плануем падвесці да яго ўсе камунікацыі, пашырыць сцэну. Зробім усё, каб пасля рэканструкцыі нашы творчыя калектывы, якія, дарэчы, вядомы на агульнанацыянальным узроўні, змаглі працаваць у больш камфортных умовах. Для жыхароў горада стане добрым падарункам магчымасць глядзець тут фільмы ў 3D-фармаце. Для гэтага мы плануем закупіць самае сучаснае абсталяванне. Нарэшце атрымаецца завяршыць рэканструкцыю школы мастацтваў, на гэтыя мэты з абласнога і раённага бюджэтаў плануецца вылучыць больш за 500 тысяч новых рублёў. У парку абновім пешаходныя дарожкі, рэканструюем фантан, добраўпарадкуем дзіцячую пляцоўку. Хочам стварыць алею маладых, масток закаханых, дзе прызначаліся б спатканні, праводзіліся вясельныя фотасесіі. А па перыметры парку збіраемся зрабіць дарожку для язды на ролікавых каньках і веласіпедах. Думаю, што пасля рэканструкцыі парк стане самым любімым месцам для адпачынку клічаўлян.

Некалькі жылых дамоў без выгод чакае маштабная рэканструкцыя, да іх за кошт бюджэтных сродкаў будуць падведзены камунікацыі. Плануецца правесці бягучы і капітальны рамонты шматкватэрных дамоў па вуліцах Крываноса, Савецкай, Ленінскай, Сацыялістычнай. На гэтыя мэты вылучаецца 2,4 мільёна рублёў. Цалкам будзе аднаўлена дарожнае пакрыццё шэрагу вуліц, пакладзены пешаходныя дарожкі. Яшчэ прыкладна 100 тысяч плануецца пусціць на добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый. Спадзяёмся, што ў навядзенні парадку каля сваіх дамоў нам дапамогуць і жыхары. Вялікія аб'ёмы работ запланаваны па абнаўленні будынкаў аграгэхнічнага каледжа, сярэдняй школы №2, дзіцячай спартыўна-юнацкай школы, бальніцы. Рыхтуюцца да свята гандлёвыя аб'екты. Наводзіцца парадак у вёсках. Тут галоўная задача — скарацiць колькасць безгаспадарных, старых і дамоў, якія пустуюць.

***— Апошнім часам Клічаў стаў добрай пляцоўкай для рэалізацыі мясцовых ініцыятыў. Якія з іх атрымалі права на жыццё?***

— Вельмі прыемна паведаміць, што з 16 заяўленых клічаўлянамі праектаў на конкурс мясцовых ініцыятыў у рамках праекта ЕС-ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» перамагло 5. Гэта праект раённага краязнаўчага музея «Творчасць без меж», накіраваны на развіццё інфраструктуры для вольнага часу і заняткаў спортам, ініцыятывы Бацэвіцкага сельвыканкама «Сельскі музей дрэва ў аграэкасядзібе «Усохі», цэнтральнай раённай бальніцы «ГемаЛаб» па павышэнні якасці медыцынскіх паслуг, цэнтра дзіцячай творчасці «Пляцоўка здароўя» і сярэдняй школы №2 — «Вермікантэйнер у кожны дом», якія дапамога ўдасканаліць сістэму жыллёва-камунальных паслуг. На рэалізацыю ўсіх гэтых праектаў Клічаў атрымае больш за 97 тысяч долараў.

***— Летась Клічаўскі раён заявіў пра сябе правядзеннем прыгожага эка-фестывалю. Як плануеце развіваць у гэтым кірунку?***

— Эка-арт-фестываль «Астравы Дулебы», які прайшоў у першыя выхадныя дні восені, выклікаў шмат прыемных водгукаў. Госці змаглі ўбачыць рыцарскія баі, спаборніцтвы лучнікаў, рэканструкцыю падзей Другой сусветнай вайны. Клічаўскі край вядомы тым, што ў гады вайны тут быў цэнтр партызанскага руху. Пра гэта нагадвае мемарыяльны комплекс каля вёскі Усакіна і ўзноўленыя партызанскі лагер, адкуль патрыёты здзяйснялі свае дыверсіі пад прыкрыццём тутэйшых лясоў. Лясы — галоўнае наша багацце, яны займаюць 60% тэрыторыі. А гідралагічны заказнік «Астравы Дулебы», які раскінуўся на плошчы больш чым 21,5 тысячы гектараў, наогул унікальная водна-балотная экасістэма. Яна падтрымлівае экалагічны баланс велізарных прыродных тэрыторый, якія калісьці засяляла старадаўняе племя дулебаў. У рамках фестывалю «Астравы Дулебы» адбыўся форум «Сацыяльна-эканамічнае, прыродаахоўнае турысцка-рэкрэацыйнае развіццё Клічаўскага раёна і сумежных тэрыторый». І там ішла гаворка пра тое, што на экалогіі і карысных выкапнях можна і трэба зарабляць. Гэтым мы і збіраемся заняцца.

**Пытанні задавала Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БДПУ РАСПАРАДЗІЎСЯ ПРЭМІЯЙ

**Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка перадаў Крывіцкаму спецыяльнаму лячэбна-выхаваўчаму прафесійна-тэхнічнаму вучылішчу закрытага тыпу падарункавы сертыфікат на суму 350 базавых велічынь.**

Калектыў БДПУ быў узнагароджаны сёлета прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», а падставай для яе атрымання стала актыўная дзейнасць у гуманітарнай сферы, значны ўклад у развіццё і папулярызацыю валанцёрскага руху сярод студэнцкай моладзі. У найлепшых традыцыях дабрачыннасці рэктарат БДПУ прыняў рашэнне аб перадачы атрыманых грашовых сродкаў тым, хто мае ў іх патрэбу ў найбольшай ступені.

У ходзе візіту ў Крывіцкае вучылішча **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК** канстатаваў: «Мы, не вагаючыся, прынялі гэта рашэнне. Вы ў сілу розных абставін апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі. Вам не проста цяпер, але вы яшчэ маладыя, жыццё ваша па-сапраўднаму толькі пачынаецца. Дзяржава падтрымлівае вас і дае магчымасць увайсці ў прафесійнае жыццё падрыхтаванымі. Вы асвойваеце патрэбныя людзям прафесіі маляра, тынкоўшчыка, аўтаслесара. Таму я ўпэўнены, што матэрыяльная дапамога, якую мы вам аказваем, зможа палепшыць не толькі матэрыяльную базу вашай навучальнай установы, а, магчыма, нават дапаможа адкрыць новую спецыяльнасць — плітачнік-абліцоўшчык».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nk@zviazda.by*

## ПАЖАР У СПЕЛЕАЛЯЧЭБНІЦЫ

**Паведамленне пра загаранне ў адной з палат рэспубліканскай бальніцы спелеалячэння ў Салігорску паступіла ў канцы працоўнага дня ад дзяжурнай медсястры.**

Прыбыўшы на месца, падраздзяленні ратавальнікаў выявілі слабае задымленне на другім паверсе трохпавярховага корпуса. Згодна з папярэдняй інфармацыяй Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, у адной з палат загарэўся кіпяцільнік. У момант узнікнення пажару ўнутры нікога не было. Медработнікі выкарысталі ўнутраны пажарны кран і справіліся з полымем да прыезду ратавальнікаў. Апошнія разам з персаналам эвакуіравалі з корпуса 54 чалавекі. Ніхто не пацярпеў. Агонь пашкодзіў ложак, тумбачку і пасцельныя рэчы. Мяркуецца, што кіпяцільнік пакінулі без нагляду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ФЕДЗЬКА ПАЧУЎ ЦЯПЛО

**У магілёўскім заасадзе свята — пасля зімовай спячкі прачнуўся мядзведзь.**

Па словах **дырэктара аграрлесатэхнічнага каледжа імя К. Арлоўскага Георгія МАЛІНОЎСКАГА**, Федзька добра выглядае і з задавальненнем ласуецца булачкамі з мёдам, смятанкай і варанай рыбкай. Схуднелым ён зусім не выглядае — багатыр вагой 170 кіло. І настрой у яго бадзёры. Высоўвае язык і ліжа лапы.

— Назіраць за насельнікамі заасада зараз адно задавальненне, — усміхаецца Георгій Маліноўскі. — Нават з дарогі бачна, як па полі гуляюць статкі зуброў, ланяў. Зіма наогул была для іх лёгкай. Вярблюдзіца Атала нават у маразы не карысталася зімовым домам, які мы спецыяльна пабудавалі для яе. Таксама радуецца вясне. Прыгажуня яшчэ тая, хутка прывязём ёй жаніха.

Па-вясноваму паводзяць сябе і астатнія жыхары заасада. А гэта першая прыкмета, што вясна не за гарамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## АРАНДАВАНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ... ЗДАВАЎ У ЛАМБАРД

**У Савецкі РУУС сталіцы з заявай звярнуліся супрацоўнікі аднаго з салонаў пракату бытавой тэхнікі. Яны растлумачылі, што да іх для арэнды электраінструментаў двойчы звяртаўся малады чалавек, які пасля не вярнуў абсталяванне ў абумоўлены тэрмін.**

Праваапарушальнікам быў 27-гадовы непрацуючы мінчанін. Малады чалавек арандаваў у пракаце дрыль-шрубавёрт, шліфавальную машынку і перфаратар, аплаціўшы суткі выкарыстання. Заўтра мужчына зноў звярнуўся ў пракат, дзе арандаваў яшчэ адну шліфавальную машынку і перфаратар, адначасова растлумачыўшы, што ўсе ўзятыя інструменты верне на наступны дзень. Аднак абяцанне сваё мужчына не стрымаў.

У ходзе разбору малады чалавек расказаў, што ўзятыя электраінструменты ён здаў у ламбард. Першы раз грошы ад рэалізацыі выдаткаваў на аплату электраэнергіі, рахунак за якую выявіўся досыць вялікім. На той момант, па словах затрымананага, неабходных сродкаў для пагашэння запазычанасці ён не меў. Аналагічную аферу мужчына вырашыў затым паўтарыць, а грошы выдаткаваць на асабістыя патрэбы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# УЗНАГАРОДА ЗА КРЭАТЫЎНАСЦЬ

Ідэя+

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Упершыню з'явілася магчымасць накіроўваць гэтыя сродкі не толькі арганізацыям камунальнай уласнасці, але і юрыдычным асобам без ведамаснай падпарадкаванасці, якія знаходзяцца на тэрыторыі вобласці. Прычым вылучаюцца грошы бязвыплатна. За перыяд з 2013 па 2015 гады ў вобласці было выдзелена і засвоена амаль 11 мільёнаў новых рублёў.

***— За кошт чаго фарміруецца гэты фонд і які чынам размяркоўваюцца яго сродкі?***

— Мясцовы інавацыйны фонд фарміруецца са сродкаў (10% ад падатку на прыбытак), якія адлічваюцца арганізацыямі камунальнай уласнасці ў мясцовы бюджэт. Іх размеркаванне адбываецца на падставе адкрытага конкурснага адбору, які праводзіць (часам нават некалькі разоў у год) аблвыканкам. Вывешваем інфармацыю на нашым сайце, рассылаем яе ва ўсе гарадскія і раённыя выканаўчыя камітэты. На працягу месяца прымаем заяўкі. У аблвыканкаме створана спецыяльная камісія, якая разглядае гэтыя інавацыйныя праекты. У яе ўваходзяць у тым ліку і прадстаўнікі навуковых арганізацый. З 2013 па 2015 гады правам на дапамогу скарысталіся Магілёўскі мясакамбінат, Магілёўская фабрыка марожанага, «Бабуліна крынка», Бабруйскі мясакамбінат, Магілёўская абласная стаматалагічная паліклініка і іншыя. Тая ж «Бабуліна крынка» з дапамогай нашых сродкаў асвоіла выпуск новага прадукту — грэчаскага ёгурту. Для Беларусі гэта была цалкам новая тэхналогія.

***— Якім параметрам павінна адпавядаць інавацыйная знаходка?***

**«Перспектыўным для нас з'яўляецца развіццё прадукцыі на аснове выкарыстання мясцовых відаў сыравіны. Гэта прадукты харчавання, дрэваапрацоўка».**

— Размова ідзе пра стварэнне і ўкараненне тэхналогій або прадуктаў абсалютна новых для нашай краіны або сусветнай эканомікі. Калі казаць сцісла, то абавязкова павінна быць новая тэхналогія, дастаткова высокі ўзровень дабаўленай вартасці і экспартная арыентаванасць.

Як адзін з прыкладаў — праект нашых стаматолагаў па засваенні новай тэхналогіі вырабу няздымнай канструкцыі зубных пратэзаў. Такая ідэя была цікава нам яшчэ і дзякуючы сваёй сацыяльнай значнасці. З дапамогай гэтай тэхналогіі працэс сканіравання зуба можа ажыццяўляцца на адлегласці. Чалавеку неабавязкова ехаць у Магілёў, каб зрабіць злепак. Гэта можна зрабіць па месцы жыхарства, а ў Магілёў прыехаць толькі для таго, каб усталяваць пратэз.

***— Ад чаго залежыць сума, якая выдзяляецца на рэалізацыю праекта?***

— Кожны праект павінен мець адпаведны бізнес-план, які будзе адлюстроўваць сутнасць ідэі, яе інавацыйную накіраванасць. Трэба таксама прапрацаваць рынкі збыту. Паколькі сродкі абмежаваныя, мы выбіраем толькі найлепшыя праекты, абавязкова ўлічваем іх сацыяльны аспект. Але спадзявацца, што фонд цалкам прафінансуе праект, нельга. Трэба, каб прадпрыемства разлічвала і на свае сродкі.

***— А вы прасочваеце, як гэтыя грошы засвойваюцца?***

— Вядома. Згодна з Указам, мы штогод да 1 красавіка накіроўваем справаздачу па кірунках выкарыстання сродкаў фонду з тлумачальнай запіскай у Дзяржкамітэт па навуцы і тэхналогіях. А камітэт да 15 красавіка робіць справаздачу ў Саўмін. Калі сродкі выкарыстаны не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем дзеючага заканадаўства, яны канфіскуюцца па рашэнні Камітэта дзяржкантролю або мясцовых фінансавых органаў Мінфіна.

***— Як гэтай формай падтрымкі могуць скарыстацца прадстаўнікі прыватнага бізнесу?***

— У нас ёсць цэлы шэраг яркіх прыкладаў. Магілёўская кампанія «Тэхналіт» ужо некалькі разоў атрымлівала сродкі інавацыйнага фонду. У прыватнасці, на падрыхтоўку і засваенне вытворчасці поршневых кольцаў з спецыяльнага чыгуну з іонаплазменным умацаваннем рабочай паверхні. Яны і самі шмат сродкаў укладваюць у развіццё перадавых ідэй, а наша дапамога дае магчымасць рэалізаваць праекты хутчэй. Такое інавацыйна арыентаванае прадпрыемства ў нас не адно. Дапамогу атрымлівалі прыватныя кампаніі «Дазатар-плюс», «Зернова», «Протас»...

***— А калі прапанова ўжо не ноухау, калі яна ўжо дзесьці рэалізуецца? Які шанс вы адсочваеце інавацыі ў маштабах краіны?***

— Падмануць нас нельга, мы робім адпаведныя запыты ў Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн наконт таго, ці вырабляецца ў нас такая прадукцыя.



**«Размова ідзе пра стварэнне і ўкараненне тэхналогій або прадуктаў абсалютна новых для нашай краіны або сусветнай эканомікі».**

Летась 28 лістапада былі ўнесены змяненні ва Указ №357. Раней кожнае міністэрства або канцэрн фарміравалі свае інавацыйныя фонды, а зараз на ўзроўні краіны існуе адзіны цэнтралізаваны інавацыйны фонд. І — абласныя, якія фарміруюцца на месцах. Разам з тым Дзяржкамітэт па навуцы і тэхналогіях гэтым змяненнем зрабіў і больш жорсткімі патрабаванні. Зараз для таго, каб фінансаваць праект, неабходна, каб ён быў уключаны ў дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

***— Хто займаецца распрацоўкай інавацыйных праектаў?***

— У першую чаргу ў гэтым зацікаўлены самі арганізацыі. Павінна быць ідэя. Узяць, напрыклад, кампанію «Тэхналіт». Яшчэ ў 2011 годзе яе дырэктар Аляксандр Бадзяка атрымаў высокую дзяржузнагароду за распрацоўку і засваенне цалкам новай для Беларусі тэхналогіі — чыгуннага ліцця метадам намарожвання. Прадпрыемства тут працавала поруч з Магілёўскім інстытутам тэхналогіі металаў. Знаходка сапраўды ўнікальная. Уяўляеце, выраб з чыгуну па трываласці не саступае вырабу са сталі.

***— У якой галіне нам не хапае інавацыйных прапаноў?***

— Перспектыўным для нас з'яўляецца развіццё прадукцыі на аснове выкарыстання мясцовых відаў сыравіны. Гэта прадукты харчавання, дрэваапрацоўка. У Магілёве рэалізаваны шэраг буйных праектаў дрэваапрацоўкі на прадпрыемствах новага пакалення «ВМГ Індустры», «Мебелайн», «Кранаспан». Іх інвестары па дапамогу да нас не звярталіся, але з улікам тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца на гэтых прадпрыемствах, яны маглі б скарыстацца такім правам. На стадыі ўкаранення новага інавацыйнага праекта знаходзіцца наша вядомае тэкстыльнае прадпрыемства «Магатэкс». Камітэт па навуцы і тэхналогіях звярнуўся ў аблвыканкам з просьбай падтрымаць іх у тым ліку і з мясцовых інавацыйных фондаў. І мы маем намер гэта зрабіць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# І БЕЗ ГРОШАЙ БЯДА, І З... ГРАШЫМА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Я па мабільным набраў апаратараў, сказаў, што я тут, побач, папытаўся, ці не змаглі б яны, што называецца, пайсці насустрач: самі выйсці да мяне на вуліцу? У адказ пачуў, што пакідаць працоўныя месцы яны не маюць права (усюды, маўляў, камеры відэаназірання). Таму мне трэба вярнуцца дамоў, аформіць даверанасць на сацыяльнага работніка і прыехаць да іх яшчэ раз.

Мне шкада стала і часу, і бензіну, дый вельмі не хацелася вяртацца без грошай.

Разумеючы гэта, сацыяльная работніца, параіла спыніць машыну каля самага ганка і паспрабаваць такі самому, з яе дапамогай, зайсці ў памяшканне.

Я так і зрабіў: да дзвярэй заставалася ўсяго восем метраў і восем прыступак. Але ногі (не кажучы ўжо пра мыліцы) сталі раз'язджацца на лёдзе, а перспектыва загрымець там мяне зусім не вабіла.

У выніку я застаўся ні з чым, а калі дакладней — з балючай крыўдай.

Вырашыў выказаць яе вышэйшаму банкаўскаму кіраўніцтву, патэлефанаваў у Петрыкаў. Пачуў, што, паводле інструкцыі, грошы і сапраўды нельга аддаваць староннім людзям — патрэбна даверанасць. І адлучацца з працоўных месцаў апаратарам таксама нельга. Значыць, мне, каб атрымаць свае ж працэнты, трэба з'ездзіць у сельскі Савет, аформіць даверанасць на сацыяльнага работніка, потым завезці яго ў ашчадную касу, а самому пастаяць пад дзвярыма...

Альбо, маючы на рахунку свае грошы, пайсці да некага пазычыць.

Урэшце якраз гэта я і зрабіў.

Тады навошта праз месяц, і ўжо аддаўшы той доўг, пішу і чаго хачу? Увагі: магчымасці самому зайсці ў магазін, у банк. А калі па нейкіх прычынах яе, такой магчымасці, няма ці стварыць немагчыма, то — *звычайнай чалавечнасці*: каб можна было патэлефанаваць, і нехта выйшаў да цябе — адказаў на пытанні, дапамог, забраў дакументы...

У тым жа банку ў Капаткевічах дзверы без упора і для калясак завузкія, на падлозе слізкі лінолеум, пандуса няма. Атрымліваецца, што людзям з інваліднасцю лепш трымаць свае грошы ў нейкай банцы і дома. Ва ўсякім разе тады дастаць іх будзе куды прасцей.

**Сяргей Іванавіч Кароткі,**
*в. Зарэчка, Петрыкаўскі раён.*

## Будзь у курсе!

# Сакавік — месяц зніжак у сталіцы

**Акцыі «Дзень зніжак» на нехарчовыя тавары пройдуць у гандлёвых арганізацыях Мінска ў сакавіку, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Так, зніжкавымі днямі ў ЦУМе «Мінск» стануць усе суботы месяца — 4, 25 сакавіка цэны зніжаны на 18%, а 11, 18 сакавіка — на 17%. Універмаг «Беларусь» будзе прадаваць тавары танней на 20% 7, 14, 21, 28 сакавіка, на 22% — 17 сакавіка. «Шчодры дзень» для каханых жанчын арганізуе 2 сакавіка «ГУМ» (зніжкі да 22%), а 16, 23, 30 сакавіка — 20%. ГД «На Нямізе» кожную сераду, суботу, нядзелю і 7 сакавіка (акцыя «Звярніце ўвагу!») будзе рэалізоўваць нехарчовыя тавары са зніжкай 20%.

«Кірмаш» плануе прадаваць тавары са зніжкай 17% 1, 7, 8, 15, 22, 29 сакавіка. У «Старт-Х» зніжка 15% на тавары будзе 1, 6, 15, 22, 29 сакавіка, у «Паўночніцы» — 4, 6, 7, 15, 22, 29 сакавіка (на асобныя групы прамысловых тавараў), у «1000 дробязяў» — 2, 9, 16, 23, 30 сакавіка, у «Вераніцы» (вул. Прытыцкага, 38) — 13, 22, 23 сакавіка. «Гаспадар і Гаспадыня» (прасп. Незалежнасці, 131/1) 15, 22, 29 сакавіка парадуе зніжэннем цэн на 20%, «Крышталь» (прасп. Незалежнасці, 39) 1, 4, 5, 15, 22, 29 сакавіка — на 15%. Крамы ГЦ «Сталіца» 8 і 25 сакавіка прапануюць зніжкі ад 5 да 50%.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Міжнародныя званкі падаражэюць

**З 1 сакавіка РУП «Белтэлекам» уносіць змяненні ў некаторыя свае тарыфы.**

Сярод іх паслугі тэлеграфнай сувязі, міжнародных тэлефонных злучэнняў, пакеты паслуг і даведачна-інфармацыйных паслуг. Змены ў кошце закрануць і некаторыя тарыфныя планы тэлебачання ZALA, а таксама паслугі доступу да сеткі інтэрнэт. Сярэдні памер павышэння кошту складзе 9% да ўзроўню тарыфаў, якія дзейнічалі да апошняга часу.

Як паведамляецца на афіцыйным сайце аператара, павышэнне тарыфаў на паслугі мясцовай і міжгародняй тэлефоннай сувязі, а таксама на паслугі доступу да сеткі інтэрнэт па лінейна-кабельным збудаванні, доступу ў сетку інтэрнэт па гарантаванай паласе прапускання і паслугі хостынгу ў 2017 годзе не плануецца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*


К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ

**ОАО «БелВитунифарм»**

Годовое общее собрание акционеров состоится **31 марта 2017 года в 12.00** по адресу: Витебский район, дер. Должа, ул. Советская, д. 26А, актовый зал. Регистрация участников будет осуществляться по указанному выше адресу, время регистрации участников собрания пройдет в день проведения собрания, с 9.00 до 11.45. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2017 г.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о работе в 2016 году. Отзыв Наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках (данных книги учета доходов и расходов) Общества за 2016 год.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2016 год.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества на 2017 год.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества на 2017 год.
8. Об утверждении размеров вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об утверждении корпоративного кодекса Общества.
10. Об установлении вознаграждения членам Наблюдательного совета на 2017 год.
11. Об утверждении порядка и критериев оценки работы Наблюдательного совета и его членов.
12. Внесение изменений и дополнений в Устав Общества.
13. О признании утратившим силу с 01.04.2016 вопроса 12 решения общего собрания акционеров Общества (протокол №13 от 31.03.2016) в связи с принятием Указа Президента Республики Беларусь от 15.03.2016 №97 «О внесении изменений и дополнений в указы Президента Республики Беларусь».

Информация о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год размещена на сайте www.belvitunifarm.by. С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 23 марта 2017 г., по месту нахождения Общества в кабинете начальника отдела правовой и кадровой работы с 12.00 до 16.00.

Тел. 8 0212 209390.

УНП 811001710 Наблюдательный совет ОАО «БелВитунифарм»



«Общее собрание кредиторов частного предприятия «Садовая Компания» по вопросу защиты требования Романенко В.М. состоится 09.03.2017 года в 15.00 по адресу:

г. Минск, пр. Победителей, д.101, оф.1, каб.1. Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 1, согласовав время с представителем управляющего по тел. 8-017-388-03-25. Более подробная информация имеется на сайте: http://bankrot.gov.by

УНП 690758990

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 сакавіка 2017 г.
№ 7 (391)


НАВІНА Ў НУМАР

## Сталіцу чакаюць шматмільярдныя інвестыцыі

**За 5 гадоў у эканоміку Мінска плануецца прыцягнуць 38,1 мільярда долараў замежных інвестыцый, заявіў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Мікалай РАГАШЧУК у рамках прадстаўлення Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця горада Мінска на 2016—2020 гады падчас сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Удзел у рабоце сесіі прыняў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч.**



Фота Надзеі БУЖАН.

«У 2016 годзе Мінск увайшоў у рэйтынг самых перспектыўных для інвестыцый еўрапейскіх гарадоў, — адзначыў Мікалай Рагашчук. — Будзе працягвацца рэалізацыя 20 інвестыцыйных праектаў з удзелам замежнага капіталу». Акрамя таго, сёння разглядаюцца магчымыя варыянты супрацоўніцтва з рознымі замежнымі кампаніямі. Прыярытэтным напрамкам з'яўляецца прыцягненне інвестыцый з Кітайскай Народнай Рэспублікі. «Мы чакаем не менш за 100 мільёнаў долараў у год», — падкрэсліў Мікалай Рагашчук.

У знешнеэканамічнай дзейнасці працягнецца актыўная работа па развіцці рынкаў збыту — для дасягнення раўнамернага размеркавання экспартных паставак паміж ЕАЭС, ЕС і краінамі далёкага замежжа. Гэта дазволіць асвоіць новыя рынкі і замацавацца на іх, а таксама скараціць магчымую залежнасць эканамічнага росту горада ад аднаго гульца.

Вынікам дасягнення пастаўленых мэт стане прырост валавога ўнутранага прадукту на 12,5%, а таксама рост рэальнай заработнай платы насельніцтва на 10%, адзначыў Мікалай Рагашчук.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

## МЯСТЭЧКА З КАСМІЧНАЙ РЫТОРЫКАЙ



**Старшыня сельскага Савета Алена БУРАК *(злева)* з выхаванцамі дзіцячага садка.**

### Прыбытковасці спартыўнага комплексу ў Тамашоўцы мог бы пазайздросціць... мост

**ТАМАШОЎСКІ сельсавет Брэсцкага раёна самы паўднёвы ў Брэсцкай вобласці. А яшчэ ён знаходзіцца ў цесным суседстве з двума дзяржавамі. Да найбліжэйшага польскага горада — каля двух кіламетраў, да адной з украінскіх вёсак — 350 метраў. У аграгарадку Тамашоўка нават няма зямлі пад участкі для будаўніцтва, бо з абодвух бакоў межы падціскаюць, таму людзям прапануюць разглядаць перспектыву будаўніцтва ў суседніх населеных пунктах.**

### З ДАПАМОГАЙ ЗЕМЛЯКОЎ

Што яшчэ адразу кідаецца ў вочы прыезджаму чалавеку — гэта касмічная рыторыка. Вуліцы Гагарына і Клімука, рэстаран «Космас», спартыўны цэнтр «Зорны»... У школе размешчаны сучасны музей касманаўтыкі. Хто не ведае, думаю, здагадаўся, што апошняе нездарма. З Камароўкі, вёскі названага сельсавета, паходзіць наш касманаўт, Герой Савецкага Саюза, Пётр Клімук. А школьным таварышам Пятра Ільіча з'яўляецца Герой Беларусі Пётр Пракаповіч. Што і казаць, пашанцавала мясцінам з землякамі. Пашанцавала ў тым сэнсе, што названыя выхадцы не толькі праславілі малую радзіму, але і грунтоўна дапамаглі з яе росквітам.

Таму аграгарадок Тамашоўка можна назваць адным з самых прыгожых на Брэстчыне. У інфраструктуру населенага пункта ўкладзены немалыя сродкі. Узведзена сучаснае камфортнае жыллё. Пры добраўпарадкаванні цэнтра вёскі ўдала выкарысталі яе прыродныя ландшафты — атрымалася кампазіцыя з мосцікам праз вадаём, якая стала ўлюбёным месцам жыхароў.

стар. 4

ТЭМА ДНЯ

## ЗАГАДАНА ЗАТРЫМАЦЦА!

### Як моладзь спакушаюць застацца пасля адпрацоўкі размеркавання

**На слова «размеркаванне» студэнты апошняга курса рэагуюць нервова. Бо вольніца скончылася і прыходзіць «расплата» за бюджэтнае навучанне. Для многіх гэта стрэс — пасля вучобы ў вялікім горадзе ехаць адпрацоўваць, як той казаў, у вірах на юрах. Многія маладыя спецыялісты, адбыўшы там свае два гады, імчаць назад: да ўлюбёных кавярняў, гіпермаркетаў і дзелавітай мегаполіснай мітусні. Не паспее адзін учорашні студэнт набрацца досведу, як на яго месца прыходзіць чарговы. Як спыніць гэты кругазварот? Ці рэальна затрымаць моладзь у маленькім гарадзе пасля адпрацоўкі? Якія сацыяльныя «пернікі» патрэбныя, каб яна заставалася на перыферыі? І чаму многія з'язджаюць нягледзячы ні на што? Адказ на гэта пытанне мы шукалі ў Ельску.**

### Хата, крама і більярд

Ускраіна Беларусі, далёка ад абласнога цэнтра Гомеля і тым больш ад сталіцы. Плюс ёсць забруджаныя радыяцыяй тэрыторыі. Насельніцтва горада і раёна — усяго 15 тысяч чалавек. Сукупнасць гэтых фактараў робіць праблему «затрымання» маладых спецыялістаў надзвычай актуальнай для Ельска. «Штогод да нас прыбывае па размеркаванні 70—100 чалавек. Пераважна ў сферы адукацыі, медыцыны, сельскай і лясной гаспадаркі, — расказвае **Вікторыя БАКЛАН, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ельскага райвыканкама.** — Мы іх запрашаем на сустрэчу з кіраўніцтвам горада і раёна, прапануем кансультацыйную дапамогу. І кожны можа звярнуцца са сваімі пытаннямі. Свае метады работы з маладымі спецыялістамі ёсць і на кожным прадпрыемстве або ва ўстанове».

стар. 2





ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## ВЫХАД З ЦЕНЮ

### Лепш легалізаваць сваю занятасць

**Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, правяла асабісты прыём грамадзян у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска.**

Да віцэ-спікера звярнуліся 14 жыхароў сталіцы. Большасць з іх хвалявала пытанне аб вызваленні ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў у сувязі з цяжкай жыццёвай сітуацыяй. Акрамя таго, грамадзянамі падымаліся праблемы, якія датычацца працаўладкавання, пенсійнага забеспячэння, жылля, транспартных зносін, аплаты жыллёва-камунальных паслуг.

Адзін з заяўнікаў, Андрэй Анатолевіч, з 2000 года працаваў у прыватніка без афіцыйнага афармлення, а ў 2014 годзе застаўся без работы, у яго паслугах наймальнік больш не меў патрэбы. Па словах мінчаніна, на афіцыйную працу ён і не спрабаваў уладкавацца, паколькі не меў нават працоўнай кніжкі і дакументаў, якія пацвярджалі б кваліфікацыю (спецыяльнасць). Збор, дарэчы, Андрэй Анатолевіч ужо аплаціў, паколькі мае пабочныя заробкі.

Марыяна Шчоткіна параіла мужчыну звярнуцца ў цэнтр занятасці, зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнага, атрымаць накіраванне на прафпадрыхтоўку, прайсці навучанне прафесіі (выбар даволі шырокі — 120 спецыяльнасцяў) і пасля легалізавацца на рынку працы. Віцэ-спікер падкрэсліла, што адна з мэт Дэкрэта №3 заключаецца ў тым, каб стымуляваць людзей, якія працуюць на ценявым рынку працы, легалізаваць сваю занятасць.

Тыдзень для Марыяны Шчоткінай выдаўся багаты на сустрэчы з выбаршчыкамі. У мінулую суботу, 25 лютага, віцэ-спікер правяла яшчэ і прамую тэлефонную лінію на тэму «Праваправапрымяняльная практыка законаў Рэспублікі Беларусь у сацыяльна-працоўнай сферы».

## КІРМАШОВЫЯ ПЫТАННІ

### Як парламентарыі рыхтуюцца да Форуму рэгіёнаў?

**Пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА адбылася нарада па пытаннях арганізацыі спецыялізаванай выстаўкі і кірмашу-продажу ў ходзе чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе 29—30 чэрвеня ў Маскве.**

Удзельнікі нарады абмеркавалі праект канцэпцыі беларускай экспазіцыі, склад арганізацый — удзельнікаў кірмашу-продажу, а таксама іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем мерапрыемстваў форуму.

## АД ДЭПУТАТА ШМАТ ЗАЛЕЖЫЦЬ

### Перш за ўсё гэта датычыцца развіцця краіны

**На мінулым тыдні намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана ГЕРАСІМОВІЧ узяла ўдзел у рабоце сесіі Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў.**

Падчас сесіі была заслухана справаздача аб рабоце Маладзечанскага раённага выканаўчага камітэта па сацыяльна-эканамічным развіцці раёна ў 2016 годзе, а таксама зацверджана справаздача аб выкананні раённага бюджэту за мінулы год. Падчас свайго выступлення Святлана Герасімовіч звярнула ўвагу на ролю мясцовых Саветаў дэпутатаў, дэпутацкіх груп, маніторынгавых груп у рэалізацыі прыярытэтаў, прадугледжаных асноўнымі палажэннямі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады, ухваленай пятым Усебеларускім народным сходам.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# НЯЗНАЧНЫХ ЗМЕН НЕ БЫВАЕ

## Як дэпутаты ўдасканальваюць дзеючыя нарматыўныя акты

**У лютым мінулага года быў выдадзены акт кіраўніка дзяржавы па ўдасканаленні работы з адабранай, арыштаванай або накіраванай у даход дзяржавы маёмасцю. У сувязі з гэтым у Палату прадстаўнікоў паступіў праект закона, што ўносіць змены і дапаўненні ў некаторыя нарматыўныя акты нашай краіны. Ён ужо прыняты ў першым чытанні, цяпер ідзе падрыхтоўка да другога.**

Нядаўна на Мінскай рэгіянальнай мытні прайшло выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі: дэпутаты рыхтуюць вышэйназваны законапраект да разгляду ў другім чытанні.

**Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі,** курыруе праект гэтага нарматыўнага акта.

— Ён распрацаваны з мэтай прывядзення ў адпаведнасць з ужо дзеючым указам Прэзідэнта, — адзначыла яна. — Прадугледжана скасаванне камісій па працы з канфіскаванай або арыштаванай маёмасцю, перадача іх функцый дэпартаменту па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым уносяцца карэкціроўкі ў законы аб паштовай сувязі і аб мытным рэгуляванні. Змены носяць карэктуючы характар, тым не менш у рамках работы па падрыхтоўцы законапраекта да другога чытання наша камісія правяла выязное пашыранае пасяджэнне, каб дэтальна пазнаёміцца з правапрымяняльнай практыкай. Безумоўна, гэта дапаможа больш якасна падрыхтаваць законапраект да другога чытання.

**Аляксандр ВАЛІЕЎ, начальнік Мінскай рэгіянальнай мытні,** падкрэсліў, што мытня пастаянна кантактуе з заканадаўчай уладай — у прыватнасці, з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.

— Глыбіннае разуменне тых праблем, якія ў законапраектах павінны быць урэгуляванымі, вельмі важнае для парламентарыяў, — лічыць ён. — Сёння ў нашай галіне так дынамічна развіваецца заканадаўства і нацыянальнае, і наднацыянальнае, што меркаваць, што будзе актуальным заўтра, нельга. Мы са свайго боку таксама развіваемся дастаткова дынамічна, праводзім шэраг эксперыментаў і рэарганізуем сваю працу такім чынам, каб гэта было хутчэй і якасней, каб было зручна для бізнесу. Што да змянення прававой асновы нашай працы, то, на маю думку, было б эфектыўна як мага часцей праводзіць падобныя сустрэчы.

**Алена КАЛЕСНІК, намеснік кіраўніка фінансава-эканамічнага ўпраўлення Дзяржаўнага мытнага камітэта,** расказала пра асаблівасці работы тых сфер мытні, якія закранаюцца законапраектам.

— У нас дзве мытні займаюцца міжнароднымі паштовымі адпраўленнямі. Нягледзячы на зніжэнне нормаў бяспошліннага ўвозу — да 22 еўра і да 10 кілаграмаў на месяц, усё роўна бачым, што дынаміка тым не менш станоўчая. Вырасла і колькасць увезеных тавараў, і сума налічаных мытных плацяжоў.

Мы з'яўляемся праваахоўнымі органамі, органамі дазнання па шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэкса. У адпаведнасці з новым законам аб аператыўна-вышуковай дзейнасці з 2015 года мы надзелены правам здзяйсняць падобную дзейнасць у поўным аб'ёме дзеля аховы нацыянальнай бяспекі. Так, мытня рэгулярна выяўляе і затрымлівае наркатычныя рэчывы, зброю і боепрыпасы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ЗАГАДАНА ЗАТРЫМАЦЬ!



**Урач Святлана ВАСІЛЕЎСКАЯ пасля адпрацоўкі засталася ў Ельску і не шкадуе аб гэтым.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)***

Адзін з галоўных «козыраў», якімі карыстаюцца кіраўнікі тутэйшых арганізацый, каб затрымаць моладзь, — гэта жыллё. Нехта выдзяляе ведамасныя кватэры, нехта кампенсуе работніку кошт здымнай «хаты». Расцэнкі на арэнду ў параўнанні са сталіцай проста смешныя: аднапакаёўку можна зняць за $25—30 плюс камунальныя. Будуюцца і новыя шматкватэрныя дамы: у іх жывуць пераважна сем'і, што атрымалі льготны крэдыт на будаўніцтва. У горадзе ўзнік цэлы мікрараён, які так і называецца — «Маладзёжны».

Дах над галавой — гэта важна. Ды пасля працы хочацца і недзе адпачыць. І пажадана культурна, а не ў завуголлі за крамай ці ў парку на лаўцы. «І ў горадзе, і ў вёсках у нас ёсць установы культуры, — расказвае Вікторыя Баклан. — А ў Ельску таксама працуюць кінатэатр з більярдным залай, спартыўны комплекс, аматарская танцавальная студыя. Ёсць рэстаран, тры кавярні, буйны сеткавы гастраном. Гандаль нехарчовымі таварамі даволі развіты за кошт прыватнага прадпрымальніцтва. А яшчэ моладзь актыўна карыстаецца інтэрнэт-крамамі».

### Меншы горад — большыя перспектывы?

Што да кар'ерных перспектыў, то ў невялікім горадзе талковы хлопец або дзяўчына можа «прабіцца» хутчэй: тут меншая канкурэнцыя. «Гэта нармальная практыка, калі доктар, адпрацаваўшы 2—3 гады і набраўшыся вопыту, ідзе на павышэнне, — тлумачыць **Наталля ЦІШКОВА, галоўны ўрач Ельскай цэнтральнай раённай бальніцы,** — і атрымлівае больш адказную пасаду. Дый на «старце» сярэдняя зарплата маладога спецыяліста-ўрача ў нашай установе — 950 рублёў. Як нам гэта ўдаецца? Падцягваем усе рэсурсы: «кантрактныя», прэмія, даплата за інтэнсіўнасць і г. д. Хоць і нагрузка даволі вялікая. Але заробак многіх заахвочвае заставацца. Плюс даём службовае жыллё».

Урач-анестэзіёлаг-рэаніматолаг Святлана Васілеўская яшчэ не так даўно лічылася маладым спецыялістам. Сама родам з вёскі ў Калінкавіцкім раёне, а медуніверсітэт скончыла ў Гродне. Святлана ўжо была замужам, калі атрымала размеркаванне ў Ельскі раён. «Муж на той момант працаваў у Гродне інжынерам-праекціроўшчыкам, — расказвае доктар. — Свайго жылля там у нас не было, а я ўжо чакала дзіця. А тут далі службовую кватэру. І мы з мужам вырашылі пераехаць у Ельск. Ён уладкаваўся на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод: і калектыў добры, і зарплата задавальняе. Купілі машыну — і муж ездзіць на працу ў Мазыр».

### «Я выбіраю мегаполіс!»

Аргументы на карысць таго, каб застацца ў Ельску, зразумелыя: цішыня, недарагое жыллё, неблагая інфраструктура. А калі яшчэ і з зарплатай не пакрыўдзілі, то можна жыць як у Бога за пазухай. Аднак у тых, хто з'язджае, ёсць аргументы не менш важкія. Караліна нарадзілася і вырасла ў Ельску. Скончыўшы Мазырскі педуніверсітэт, адпрацавала два гады на малой радзіме. Пасля дзяўчына пераехала ў Мінск, дзе таксама працуе па спецыяльнасці, бо лічыць настаўніцтва сваім прызваннем. Родны Ельск згадвае з настальгіяй, але вяртацца туды не спяшаецца. Больш таго: рашэнне з'ехаць адтуль саспела ў яе яшчэ да паступлення ў ВНУ. «Па-першае, я чалавек амбітны, а ў малым горадку мне асабліва няма куды расці, — кажа малады педагог. — Па-другое, як і любая дзяўчына, я задумваюся пра сям'ю і дзяцей. А ў Ельску вартыя ўвагі мужчыны даўно жанатыя. У мегаполісе больш магчыма знайсці сваю «палавінку». Па-трэцяе, у маленькім горадзе ты нібы пад лупай. А ў Мінску нікому няма да цябе справы».

Ці ёсць, на думку Караліны, плюсы ў маленькага горада? «У Ельску дзеці і іх бацькі ставяцца да настаўнікаў з большай павагай, — сцвярджае дзяўчына. — А сталічныя школьнікі больш ведаюць пра свае правы, чым пра абавязкі. Акрамя таго, Ельск — гэта пацярпелы ад Чарнобыля раён. Два разы на год я разам з вучнямі ездзіла ў санаторый. Але ў Мінску ў мяне больш прастору для развіцця. Як класны кіраўнік, я бываю з вучнямі ў тэатрах, музеях, на спартыўных арэнах. І праблема, куды схадзіць у свой вольны час, таксама не паўстае. Таму я выбіраю тлум мегаполіса».

Сярод мінусаў сталічнага жыцця Караліна адзначае дарагоўлю жылля. За арэнду сціплага пакойчыка настаўніца аддае палову сваёй невялікай зарплаты. Дзяўчына суцяшае сябе тым, што не ўсё прыходзіць адразу. «Калі атрымаю катэгорыю, то і заробак вырасце. А пакуль можна і пацярпець крыху. Галоўнае, што ў мяне ёсць мэта».

### Незваротныя страты

З аднаго боку, 60—70 працэнтаў ураджэнцаў Ельшчыны, адвучыўшыся ў іншых гарадах, вяртаюцца па размеркаванні на малую радзіму, нараджаюць дзяцей і пускаюць тут «карані». (І гэта добры паказчык для горада з насельніцтвам менш за 10 тысяч чалавек.) Даступнае жыллё і неблагая для райцэнтра інфраструктура — як кажуць, лепей сініца ў руцэ, чым журавель у небе. Дый адными «пернікамі» ўчарашняга маладога спецыяліста на перыферыі не затрымаеш. Бо ўсё вызначаецца менталітэтам чалавека. Камусьці даспадобы няспешлівасць правінцыйнага жыцця. Іншых — хоць ты пабудуй ім катэдж з басейнам і верталётнай пляцоўкай — вабяць агні вялікага горада. Таму 30—40 працэнтаў тых, хто з'ехаў, — гэта незваротныя «страты», з якімі варта змірыцца. Правінцыя заўсёды жывіла людскімі рэсурсамі вялікія гарады. І людзі родам з глыбінкі часта дасягаюць у мегаполісах немалых поспехаў. Бо сітуацыя «пан ці прапаў» прымушае варушыцца. Таму перыферыя з яе нібыта адсутнасцю перспектыў — сапраўдная «кузня» маладых і ініцыятыўных кадраў. Кадраў, што імкнуцца даказаць: мы таксама не абарой хлеб кроім. Але для падтрымання ў гэтай кузні «агню» патрэбныя рэсурсы: жыллё, даплаты да заробку і дадатковыя льготы. Каб ствараліся новыя сем'і, нараджаліся дзеці. Аднак ці кожны раён і ці кожнае прадпрыемства на перыферыі можа дазволіць сабе гэткую раскошу — «пернікі» для маладых?

**Валянцін БОЙКА.** *boika@zviazda.by*

# Ад банкруцтва да аздараўлення — адзін крок?

## Сенатар аб тым, што варта зрабіць, каб адказ на гэтае пытанне быў станоўчым

**У крызіс самыя стойкія прадпрымальнікі не тонуць, а выплываюць на паверхню па свежае паветра, пераарыентоўваючы вытворчасць пад новыя патрэбы рынку. І па жыцці так: хтосьці ў неспрыяльных абставінах апускае рукі, а хтосьці да апошняга шукае выйсце — у залежнасці ад светапогляду. Так і з банкруцтвам. На першы погляд, адмоўная з'ява мае прыхаваныя магчымасці. Але, каб іх атрымаць, сёння трэба прыкласці нямала намаганняў. Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах ужо не першы год аналізуе, наколькі эфектыўна працуе інстытут банкруцтва ў нашай краіне. Пра гэта і тое, з якімі праблемамі можа сутыкнуцца неплацежаздольнае прадпрыемства, расказаў спецыяльна для «МС» старшыня Пастаяннай камісіі Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.**



***— Уладзімір Іванавіч, наколькі вострай для нашай краіны з'яўляецца тэма банкруцтва дзяржарганізацый?***

— Па даных Міністэрства эканомікі, у першым паўгоддзі мінулага года меры па фінансавым аздараўленні прымяняліся да 875 дзяржаўных арганізацый, а гэта 68% ад усіх неплацежаздольных арганізацый па даных на пачатак мінулага года. З іх распрацаваныя меры выканалі 393 арганізацыі, а не справілася, на жаль, большасць — 482. Прытым з першых аднавілі плацежаздольнасць усяго 55, палепшылі яе 477 прадпрыемстваў. Асноўныя прычыны фінансавых няўдач — рост крэдыторскай запазычанасці, тарыфаў на сыравіну, а таксама недахоп абаротных сродкаў для павелічэння аб'ёмаў прадукцыі і продажаў адпаведна.

Але сёння ад банкруцтва не застрахаваны ніхто. Рэзкае падзенне попыту, немагчымасць расплачвацца па даўгах, складанасць прыцягнення крэдытаў і шэраг іншых прычын здольныя ператварыць у банкрута любое паспяховае і ўстойлівае ў фінансавым плане прадпрыемства...

***— Няўжо ўсё так песімістычна?***

— Банкруцтва суб'ектаў гаспадарання можа і павінна несці ў сабе і стваральную сілу. Яго прамой задачай з'яўляецца павышэнне гарантый зваротнасці інвестыцый, а гэта азначае рост іх прытоку ў краіну. Такім чынам, умовы для інвестыцый калі і трэба мяняць, то толькі ў лепшы бок. Рабіць усё, каб інвестар разумеў, што ўкладанні ў Рэспубліцы Беларусь выгадныя і надзейныя. Пры гэтым без банкруцтва не абыходзіцца ввядзенне спраў ні ў адной дзяржаве. «Эканоміка, у якой не бывае банкруцтваў, абавязкова збанкрутуецца», — такую думку выказаў расійскі журналіст Максім Званароў. Таму наша прамая задача — накіраваць непазбежны для эканомікі працэс у правільнае рэчышча.

Закон аб банкруцтве прадугледжвае наступныя стадыі працэдуры: спачатку ўласнікі, заснавальнікі і органы ўлады (калі гэта датычыцца дзяржпрадпрыемстваў) прымаюць меры па папярэджанні банкруцтва, другая стадыя — гэта дасудовае аздараўленне, трэцяя — эканамічная неплацежаздольнасць, санацыя (працэдура аздараўлення) і чацвёртая — банкруцтва з ліквідацыяй. Сёння такая сістэма дазваляе падтрымліваць у працэдуры банкруцтва не больш за 100 прадпрыемстваў дзяржсектара.

У той жа час мы задаёмся пытаннем: як зрабіць так, каб паспяховага бізнесу было больш, а прадпрыемстваў-банкрутаў — менш? Што рабіць з горадаўтваральнымі, сацыяльна значнымі прадпрыемствамі, якія маюць патрэбу ў фінансавым аздараўленні? Тут з аднаго боку аказваюцца рынкавыя законы, без выканання якіх немагчымая здаровая эканоміка. З другога — людзі, інтарэсы якіх неабходна ўлічваць.

***— Як у такім выпадку абараняць інтарэсы людзей?***

— Асабліва вострае сацыяльнае напружанне ўзнікае, калі на мяжы банкруцтва аказваюцца малыя і сярэднія прадпрыемствы ў гарадах і пасёлках, калі гаворка ідзе пра затрымкі зарплаты. Падае якасць жыцця, адбываецца дыскваліфікацыя і дэмаралізацыя асобных груп работнікаў. Пратэрмінoўкі зарплаты не толькі адмоўна ўплываюць на сацыяльную абстаноўку, але і наносяць удар па ўзнаўленні працоўных рэсурсаў, гарантыях пенсійнага забеспячэння.

З пункту гледжання сацыяльных гарантый беспрацоўны мае права на дапамогу пры страце заробку. А працаўнік, які страціў сродкі для існавання ў выніку банкруцтва, падобнага права пазбаўлены і павінен чакаць кампенсацыі ад работадаўцы. Больш таго, чалавек, які працуе без зарплаты на арганізацыю-банкрута, фармальна прызнаецца працуючым. А жыць жа яму на штосьці трэба!

***— Каму варта накіроўваць вырашэнне гэтага пытання?***

— Савет Рэспублікі ўжо накіраваў яго да профільнага міністэрства — Мінпрацы. Мы лічым, што менавіта гэтай структуры неабходна клапаціцца пра такую жыццёва важную для многіх работнікаў праблему і выступаць ініцыятарам распрацоўкі механізма безумоўных выплат за працу. Спагнанне даўгоў — доўгая і працаёмкая працэдура. Працоўныя калектывы не павінны наймаць адвакатаў або іншых спецыялістаў, каб разбірацца ў прычынах пратэрміноўкі зарплаты. Такім чынам, без спецыяльных кампенсацыйных механізмаў не абысціся. Пытанне ў тым, якімі ім быць і на якіх умовах яны павінны стварацца?

Сёння варыянты вырашэння праблемы запазычанасці па аплаце працы можна разглядаць як своеасаблівую мадэль карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці. Будучы механізм павінен знізіць узровень сацыяльнай напружанасці і працоўных канфліктаў, палепшыць фінансавую дысцыпліну, узмацніць адказнасць работадаўцы перад работнікам і, галоўнае, рэалізаваць цывілізаваны падыход да ўрэгулявання адносін паміж работнікамі і работадаўцам, а не карыстацца гвалтоўным спыненнем працы, правядзеннем акцый пратэсту ці іншымі радыкальнымі мерамі.

> Асноўныя прычыны фінансавых няўдач — рост крэдыторскай запазычанасці, тарыфаў на сыравіну, а таксама недахоп абаротных сродкаў для павелічэння аб'ёмаў прадукцыі і продажаў адпаведна.

***— Якія яшчэ праблемы ў сферы банкруцтва пакуль не вырашаны?***

— Па-першае, дагэтуль існуе несвоечасовая ініцыяцыя праблемным прадпрыемствам свайго банкруцтва, што прыводзіць да значных страт дзяржавы і супрацоўнікаў установы, а таксама зніжае магчымасці захаваць арганізацыю. Тут яшчэ належыць распрацаваць дадатковыя стымулы. Для гэтага трэба актывізаваць работу камісій па папярэджанні эканамічнай неплацежаздольнасці. Але ў аднаўленні плацежаздольнасці павінны быць зацікаўлены, перш за ўсё, самі прадпрыемствы.

Па-другое, вялікая колькасць крэдытораў ад дзяржавы робіць выплату даўгоў больш складанай, заблытанай. Прапанаванае камісіяй рашэнне — вызначэнне кансалідаванага (адзінага) крэдытора ад імя дзяржавы ў асобе падатковых органаў. Усё гэта мусіць адбывацца з урэгуляваннем механізма перадачы яму фіскальных патрабаванняў, што дазволіць скараціць тэрміны і працэсуальныя выдаткі.

Па-трэцяе, мы падтрымліваем падыход да прадстаўлення кандыдатур антыкрызісных кіраўнікоў і іх прызначэння ў канкрэтныя справы выпадковым спосабам. Але прапануем асноўны аб'ём кантролю за імі перанесці на сходы крэдытораў.

Па-чацвёртае, трэба перавесці таргі па продажы маёмасці даўжніка (коштам звыш вызначанай мяжы) выключна ў электронную форму.

Усе гэтыя прапановы — вынікі аналізу, які мы праводзім не першы год. Нягледзячы на тое, што наша галоўная задача — унесць змены ў заканадаўства, кожную з іх мы бяром з жыцця: гутарым з людзьмі, наведваем прадпрыемствы, улічваем прапановы кіраўнікоў кампаній. Напрыклад, у гэтым месяцы выязджалі ў Магілёў, дзе абмяркоўвалі тэму банкруцтва разам з выканаўчай уладай, Міністэрствам эканомікі, дырэктарамі дзяржаўных прадпрыемстваў. Бо для парламентарыя галоўнае памятаць пра тое, што законы створаны перш за ўсё для людзей і ўнесеныя змены мусяць ісці менавіта ад іх.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
pustavit@zviazda.by



**Падчас наведвання магілёўскай швейнай фірмы «Вяснянка», якая зараз праходзіць працэдуру санацыі.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЭКАНОМІКА

# ПАЗЫКА ЦЯГНЕ ПАЗЫКУ

## Сітуацыя з неплацяжамі за адгружаную лікёра-гарэлачную прадукцыю разгледжана на калегіі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці

Найбольш праблемнымі даўжнікамі з'яўляюцца прадпрыемствы спажывецкага таварыства, паведаміў **старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.** Так, запазычанасць Гродзенскага філіяла перад вытворцамі алкагольнай прадукцыі перавысіла 2 млн рублёў. Агульная сума неплацяжоў прадпрыемстваў гандлю на пачатак лютага склала 5,7 млн рублёў.

З-за гэтага вытворцы не могуць заплаціць падаткі ў бюджэт. Так, за мінулы год у рэгіён паступіла акцызаў за рэалізацыю алкаголю на суму 77 млн рублёў, а гэта 88,6% ад папярэдняга перыяду. Сёлета агульная запазычанасць перад бюджэтам складае 4 млн рублёў. У Камітэце дзяржкантролю адзначылі, што заводы па выпуску алкагольнай прадукцыі (у вобласці гэта Гродзенскі лікёра-гарэлачны, Слонімскі віна-гарэлачны заводы і Навагрудскі вінзавод) уваходзяць у дваццатку, а некаторыя ў дзясятку горадаўтваральных прадпрыемстваў рэгіёна. А 30% усіх паступленняў складаюць менавіта акцызныя падаткі. Анатоль Дарожка нагадаў аб асабістай адказнасці мясцовых улад за пагашэнне запазычанасці за алкагольныя напіткі, аб чым папярэджваў на нарадзе па пытаннях вытворчасці і абароту алкагольнай прадукцыі кіраўнік дзяржавы.

Па словах **намесніка начальніка абласной падатковай інспекцыі Тамары СТАСЕВІЧ,** палова запазычаных плацяжоў спагнана ў прымусовым парадку, больш за 160 лістоў накіравана ў рэвізійныя органы. Па выніках праверкі 24 прыватныя прадпрыемствы пазбаўлены ліцэнзіі, дзейнасць яшчэ пяці часова прыпынена.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** margo@zviazda.by

# МЯСТЭЧКА...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*


Пра апошняе сведчаць замкі з характэрнымі сардэчкамі, што пакідаюць на канструкцыях моста закаханыя. А навакольны сасновы лес робіць тутэйшае паветра гаючым. Нездарма ж у Тамашоўцы размясцілі дзіцячы санаторый. Адным словам, цяперашняя інфраструктура разам з добраўпарадкаваннем дазваляюць лічыць населены пункт сапраўды невялікім аграрным гарадком.

## ДЛЯ СВАІХ І ДЛЯ ГАСЦЕЙ

Адзін толькі фізкультурна-спартыўны цэнтр «Зорны» многага варты. Аб'ект мае статус раённай спартыўнай установы. Тут навучаюцца плаванню дзеці са школ Брэсцкага раёна, у цэнтры функцыянуе басейн. Намеснік дырэктара цэнтра Анатоль ШАРАПАЎ вядзе секцыю па плаванні для дзяцей. Ён расказаў, з якім задавальненнем займаюцца тут хлопчыкі і дзяўчаткі з Тамашоўкі і навакольных вёсак. «І тыя вучні, якіх возяць на заняткі па школьнай праграме з іншых школ, праз месяц-другі ўпэўнена трымаюцца на вадзе», — заўважыў Анатоль Васілевіч. У цэнтры таксама працуюць розныя гурткі і секцыі, тут ёсць добрая спартыўная зала і футбольнае поле-стадыён. Сёння можна гаварыць пра «Зорны» як сацыяльны аб'ект. Бо платныя паслугі, што аказваюцца тут насельніцтву, пакрываюць толькі невялікую частку расходаў, цэнтр знаходзіцца на ўтрыманні раённага бюджэту.

Хоць будаваўся «Зорны» дзесяць гадоў таму з размахам. І трэба сказаць, базу наведваюць многія вядомыя спартыўныя калектывы. Напрыклад, алімпійская зборная каманда па лёгкай атлетыцы (спрынт) праводзіла зборы перад Пекінам у Тамашоўцы. Не абмінаюць комплекс брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова, «БАТЭ» з Барысава, «Цмокі—Мінск». І яшчэ шмат беларускіх камандаў па розных відах спорту пакінулі запісы ў кнізе водгукаў пасля паспяховых трэніровак і збораў. Побач размешчана гасцініца на 80 нумароў. Гатэль невялікі, утульны, мае сваю трэнажорную залу, што асабліва цэняць спартсмены. У трох мінутах хадзьбы — рэстаран, дзе ўлічваюць усе пажаданні кліентаў і па заяўцы могуць прыгатаваць абед ад вельмі каларыйнага да сціплага, бюджэтнага, разлічанага на школьніка. Акрамя таго, прыезджыя цэняць чыстае паветра аграгарадка ў акружэнні сасновых лясоў. Больш таго, у лесе абсталяваны экалагічныя сцяжыны, якія можна ўдала скарыстоўваць для прабежак. Адным словам, жыві і трэніруйся.

Так і рабілі многія госці. Некалькі гадоў запар у Тамашоўцы праводзілі зборы расійскія каманды. Гэта было выгадна для «Зорнага». Каманды прыязджалі на паўтара-два месяцы, разлічваліся адразу, а яшчэ давалі дадатковую выручку мясцовым гандлёвым ды іншым аб'ектам.

Але апошнім часам расіяне перасталі выбіраць «Зорны» месцам для збораў. Яны тлумачаць перамену дыслакацыі тым, што ў Расіі за апошнія гады паявілася шмат сваіх спартыўных баз. Ну хоць бы ў Сочы шмат чаго пабудавалі. Цяпер трэба тыя базы запаўняць, менавіта на гэта арыентуюць расійскіх спартсменаў дома.

## БАНКАМАТ — НЕ РАСКОША

Хоць **старшыня сельскага Савета Алена БУРАК** адзначае, што не толькі ідэалагічныя ўстаноўкі расійскіх спартсменаў уплываюць на выбар месца збораў. Госці звяртаюць увагу на любыя дробязі арганізацыі побыту. Гэта ж не турысты, якія прыязджаюць на дзень-другі. Калі людзі жывуць у населеным пункце два месяцы, яны хочуць карыстацца ўсімі выгодамі сучаснай цывілізацыі. А ў Тамашоўцы, напрыклад, узялі і дэманціравалі банкамат. Раней ён быў у мясцовым аддзяленні банка, цяпер—няма. Людзі і подпісы збіралі, і звароты накіроўвалі, але адказы былі катэгарычныя, сэнс іх прыкладна такі: «Не будзе ў вас банкамата, не марнуйце час на просьбы».



У басейне «Зорнага».



Урач Аліцыя ЛАНКЕВІЧ і акушэрка Ганна ЗІНОВІЧ перад прыёмам.

— Вось вам і аграгарадок, — усміхнулася ў адказ на маё пытанне наведвальніца аддзялення Надзея Пятроўна. — Калі мы збіралі подпісы за вяртанне банкамата, да нас прыехалі прадстаўнікі банка і сказалі, што навучаць нават пенсіянераў плаціць за камунальныя паслугі з дапамогай смартфонаў. А як сталі ладзіць той майстар-клас, то сувязь прапала... Мы ж жывём у крайнім паўднёвым пункце краіны, далей мяжа, не дзіва, што з сувяззю здараюцца перабоі. Так нічога і не выйшла ў нашых інструктараў. Таму самае лепшае для нас было б вярнуць банкамат. Тым больш што да найбліжэйшага — 60 кіламетраў.

Відавочна, што забеспячэнне названымі паслугамі — адна з праблем аддаленага ад райцэнтра аграгарадка. Аддзяленне банка працуе ў рабочыя дні, у суботу некаторыя банкаўскія аперацыі выконвае пошта. А ў нядзелю нават папоўніць баланс мабільнага тэлефона альбо тэрмінова зняць грошы з карткі немагчыма.

## ГРАМАДСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

Што датычыцца грамадскай ініцыятывы, то яна распаўсюджваецца не толькі на збор подпісаў ды звароты ў розныя інстанцыі. Калі ўзнікла пытанне пра добраўпарадкаванне вадаёма, людзі арганізавалі збор грошай і зрабілі добрую справу талакой. Вадасховішча Орхава, у трох кіламетрах ад Тамашоўкі, заўсёды было ўлюбёным месцам адпачынку. Апошнім часам вадаём стаў мялець. Гэта пытанне па ініцыятыве дэпутатаў разглядалі летась на сесіі. Там і вырашылі стварыць ініцыятыўную групу. Завадатарамі выступілі Сяргей Плаксін, Яўген Пяткевіч і Аляксей Жылінюк. Спачатку склалі зварот да жыхароў, каб грамадзяне з кожнага двара здалі па 20 рублёў. І людзі праявілі разуменне. Для гаспадара не такія вялікія грошы, а для возера збярэцца прыстойная сума, каб яго пачысціць, добраўпарадкаваць і падпампаваць вады. Да гэтага за кошт сродкаў сельскага Савета на беразе ўстанавілі сметніцы, сёлета плануецца паставіць лаўкі для адпачынку. Адным словам, ваколіцы вадаёма паступова прыгажэюць, а рыбакі, адпачывальнікі самі будуць сачыць за парадкам.

— Парадак для аграгарадка Тамашоўка — гэта справа гонару, — гаворыць стараста вёскі Пётр Кінчак. — Таму бываюць і суботнікі, распаўсюджваецца вопыт асобных гаспадароў, якія змаглі ператварыць свае двары ва ўзорныя.

## ТЭНДЭНЦЫЯ, АДНАК...

Аб'екты адукацыі і аховы здароўя ў мястэчку на ўзроўні. Амбулаторыя замест старой тут была ўзведзеная ў 1993 годзе. Гэта тыповы для таго часу комплекс, які ўключае ў сябе непасрэдна амбулаторыю з дзённым стацыянарам і аптэкай, а яшчэ тры кватэры для медыкаў. Падчас уладкавання аграгарадка медыцынская ўстанова перажыла капітальны рамонт, яе аснасцілі сучасным абсталяваннем. Як расказала ўрач Аліцыя ЛАНКЕВІЧ, і медыкі, і пацыенты ўдзячныя Пятру Пятровічу Пракаповічу за спонсарскую дапамогу. Цяпер лячэбная ўстанова мае добрае абсталяванне для фізіятэрапеўтычных працэдур, сучасны апарат ЭКГ ды іншае абсталяванне. Сёння сельская ўстанова аховы здароўя абслугоўвае дзве з паловай тысячы чалавек, з іх 511—дзеці.

А вось у дзіцячым садку месцаў не хапае. Летась— упершыню за апошнія гады— нараджальнасць па сельсавеце перавысіла смяротнасць. Значыць, тэндэнцыя замацоўваецца. А ўжо сёння, каб задаволіць усе заявы бацькоў, трэба адкрываць яшчэ адну групу. Значыць, неўзабаве паўстане пытанне аб прыбудове да садка. Адкрыць групу ў прыватнай кватэры, як рэкамендаваў аддзел адукацыі, пакуль не ўдаецца. Гэта наогул складана ва ўмовах сельскай мясцовасці. Будучыя школьнікі павінны таксама выхоўвацца ў добрых умовах. У школе ж ёсць усё не толькі для вучобы, але і для фарміравання гарманічнай асобы. Спартыўны цэнтр «Зорны», пра які ішла гаворка вышэй, першапачаткова ўзводзіўся як школьны. Яго першымі карыстальнікамі па-ранейшаму застаюцца вучні.

* * *

З Тамашоўкі ў добрае надвор'е бачныя касцёлы і будынкі суседняга польскага горада Владавы. Кажуць, што да горада не больш за два кіламетры з улікам Буга, які раздзяляе населеныя пункты і дзяржавы. Мост узарвалі яшчэ ў мінулую вайну і не адбудавалі нанова. Суседскія стасункі цяпер адбываюцца праз пераход Дамачава. Суседзі з захапленнем разглядалі спартыўны комплекс «Зорны», гаварылі, што ў іх падобныя паслугі каштуюць нашмат даражэй, а ахвотных штодня наведваць басейн, спартыўную і трэнажорную залы знайшлося б нямала. Ну і нашы, ведама, пайшлі б у Владаву па пакупкі. Патрэбныя толькі мост ды малы прыгранічны рух, пра які гаворыцца ў абедзвюх краінах даўно...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

**Брэсцкі раён**

***Людміла ЖУКОВІЧ, старшыня Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў:***

— Са 141 населенага пункта раёна 12 маюць статус аграгарадка. Сёння аграгарадок значна адрозніваецца ад шараговага населенага пункта. Найперш развітой сацыяльнай інфраструктурай, сферай паслуг, новым камфортным жыллём для прыцягнення маладых спецыялістаў. І галоўнае, у вёску прыйшлі суб'екты прыватнай формы ўласнасці, а гэта новыя вытворчасці, рабочыя месцы і заработная плата. Каля 80 працэнтаў малога бізнесу раёна сканцэнтравана ў аграгарадках і ваколіцах. У выніку развіцця аграгарадкоў і, перш за ўсё, інтэнсіўнага жыллёвага будаўніцтва ўзнікаюць новыя праблемы ў частцы інжынернай і дарожна-транспартнай інфраструктуры.

Рэалізацыя Праграмы адраджэння і развіцця вёскі адыграла важную ролю ў паляпшэнні аблічча сельскіх населеных пунктаў і тэрыторый. Але неабходна рухацца далей. Для таго каб аграгарадок застаўся ў сваім статусе, трэба знаходзіць крыніцы фінансавання па вырашэнні праблем дарожнай і інжынернай інфраструктуры, што паспрыяе якасці жыцця сельскіх жыхароў.

## Устаноўлены надбаўкі да закупачных цэн

**У Беларусі ўстаноўлены надбаўкі да закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю, што закупляецца ў насельніцтва, у 2017 годзе. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання №11 ад 9 лютага 2017 года, якая была апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Памер надбаўкі за адзін кілаграм малака буйной рагатай жывёлы базіснай тлустасці, што закупляецца ў насельніцтва і пастаўляецца арганізацыям для наступнай перапрацоўкі, складзе Br0,04. За адзін кілаграм маладняку буйной рагатай жывёлы жывой вагой да 100 кілаграмаў, што закупляецца ў насельніцтва арганізацыямі для вырошчвання, надбаўка будзе ў памеры Br0,40. У 2016 годзе надбаўкі былі ўстаноўлены ў памеры Br370 і Br3 750 (да дэнамінацыі) адпаведна. Пастанова ўступіла ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання і распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі з 1 студзеня 2017 года.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

## Цэх закрылі пасля праверкі

**Кампанія «Рэсттрэйд» зарэгістравана і дзейнічае ў Полацку. А некалькі гадоў таму таварыства з абмежаванай адказнасцю набыло чатыры магазіны і цэх кулінарнай прадукцыі ў Брэсце. Нядаўна аб'екты праверыў Камітэт дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці. У магазінах выяўлены шматлікія парушэнні, накшталт рэалізацыі пратэрмінаванай прадукцыі. За дні праверкі з гандлёвага абарачэння выключана прадукцыі на 314 рублёў.**

Але найбольш нараканняў у супрацоўнікаў кантрольнага органа выклікаў цэх па вытворчасці кандытарскіх вырабаў, які размешчаны ў супермаркеце «Дыяніс-1» па вуліцы Маскоўскай. Тое, што пры вырабе кандытарскай прадукцыі не захоўваецца тэхналогія ў частцы ахалоджвання вырабаў з крэмам з прычыны адсутнасці халадзільнай камеры, — самае дробнае парушэнне з зафіксаваных. Кантралёры выявілі, напрыклад, што ў работу ішло не свежае, часткова сапсаванае ківі. А пералік выпадкаў антысанітарыі ў памяшканні і пры вытворчым працэсе займае палову старонкі тэксту.

Як паведаміў **намеснік начальніка аддзела Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці Уладзімір БЕЛАВУСАЎ,** дзейнасць цэха кандытарскага забароненая да поўнага выпраўлення ўсіх выяўленых парушэнняў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

КАБ ПАМЯТАЛІ

# Бараноўшчына: вуліца-прывід



Той самы мемарыяльны камень, які паведамляе, што вёска Бараноўшчына пачала сваю гісторыю з фальварка яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя.

## Чаму на ўсіх картах Мінска пазначана вуліца, якой у рэчаіснасці не існуе?

**На самай справе, нягледзячы на ўсю абсурднасць сітуацыі, з ёй звязана вельмі асабістая і кранальная гісторыя. Каля месяца таму ў рэдакцыю патэлефанавала пажылая жанчына. У вялікім артыкуле, змешчаным у нашай газеце і прысвечаным вёскам, якія «паглынуў» Мінск, Бараноўшчына згадвалася ўсяго ў некалькіх сказах, але гэтага аказалася дастаткова, каб прыцягнуць пільную ўвагу Ліліі Мяфодзьеўны...**

А ўсё таму, што яна прачытала: вуліца з такой назвай цяпер існуе. І сапраўды, чалавеку, блізка не знаёмаму з сітуацыяй, цяжка ў гэтым усумніцца. Пошук у інтэрнэце з упэўненасцю выдае карты з дакладным месцазнаходжаннем Бараноўшчыны. Аднак калі вывучыць іх больш падрабязна, аказваецца, што на вуліцы не засталося ніводнага дома. Вось і атрымліваецца такі цуд, але не прыроды, а гарадской гаспадаркі: сама вуліца быццам бы ёсць, а пабудоў на ёй няма, а раз будынкаў няма, то якая ж гэта вуліца?

Але Лілія Мяфодзьеўна не бачыць нічога смешнага ў такім стане рэчаў, бо па справядлівасці гэту назву павінна была б насіць не тое што вуліца — а цэлы мікрараён! Калі мы вернемся на паўстагоддзя назад, то ўбачым, што Бараноўшчына была даволі буйной вёскай. Тут размяшчаліся малочнатаварная ферма, кузня, складскія збудаванні, парнікі, некалькі крам і нават свая школа. Менавіта школа і звязала лёс жанчыны з гэтай вёскай. Нягледзячы на тое, што сям'я жыла ў Мядзведжына, тады яшчэ дзяўчынка Ліля скончыла пачатковую школу ў Бараноўшчыне, а яе сястра і наогул выпусцілася з гэтай навучальнай установы, і самае галоўнае — іх бацька працаваў там дырэктарам.

— Мне б вельмі не хацелася, каб гісторыя вёскі, нават калі яна сама і не захавалася, была бясследна сцёртая з памяці людзей. І гэта не толькі з-за маіх уласных перажыванняў, якія ў першую чаргу звязаны з ушанаваннем майго бацькі, якому сёлета магло б споўніцца 105 гадоў, але і таму, што там жылі і працавалі годныя людзі, лічылі гэта месца сваім домам, яно на ўсё жыццё засталося для іх значным, — разважае Лілія Мяфодзьеўна.

Калі жанчына выйшла на пенсію, яна занялася гэтым пытаннем ушчыльную. Да таго, як у 1978 годзе Бараноўшчына ўвайшла ў склад сталіцы і яе жыхароў напаткалі сур'ёзныя перамены, вёска размяшчалася ў межах цяперашніх вуліц Цімашэнкі і Лабанка, уздоўж вуліцы Прытыцкага, тады яшчэ Ракаўскай шашы. Такім чынам, цяжка растлумачыць, чаму мікрараён, а ў далейшым і станцыя метро атрымалі назву зусім невялікай, на 4—5 двароў, вёскі Кунцаўшчына, якая знаходзілася зусім у іншым месцы — там, дзе зараз Чырвоны Бор, а такое велізарнае селішча было практычна цалкам праігнаравана.

Аднапавярховыя дамкі, якія раней адносіліся да вёскі, а потым да аднайменнай вуліцы, зносілі паступова. Асабліва доўга трымаўся адзін дом — ці не на дзесяцігоддзе даўжэй, чым усе астатнія, — па адрасе Бараноўшчына, 23. Магчыма, менавіта з-за яго блытаніна і ўзнікла. Тым не менш настойлівая жанчына вырашыла разабрацца ў сітуацыі да канца, таму патэлефанавала ў навакольныя паліклінікі і паштовыя аддзяленні, спрабуючы даведацца, ці абслугоўваюцца там жыхары гэтай вуліцы. У адказ усюды пачула — не! Аднак, напрыклад, у анлайн-даведніку паштовых індэксаў да гэтага часу без цяжкасцяў можна адшукаць індэкс Бараноўшчыны. Праўда, пісаць лісты ўжо няма куды...

Спрабуючы неяк выправіць сітуацыю, прадстаўнікі гарадскіх улад вырашылі прысвоіць назву Бараноўшчына хоць бы прыпынку грамадскага транспарту. Праўда, прыпынак не самы загружаны, ды і адсутнасць прывязкі да існуючых зараз у мікрараёне назваў, хутчэй, уводзіць у ступар жыхароў сталіцы, чым нагадвае пра гістарычнае мінулае гэтага месца.

Такі вынік Лілію Мяфодзьеўну не задаволіў, таму ў верасні 2014 года яна звярнулася на прамую лінію да кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна. Ён яе запэўніў, што пытанне ўжо прапрацоўваецца, хутка будзе прынята рашэнне. Праз некаторы час, калі жанчына ўжо нават перастала чакаць, яна атрымала афіцыйны адказ. Выйсце знайшлося: усталяваць мемарыяльны камень у памяць аб вёсцы, якая існавала на гэтым месцы. Адкрыццё помніка прымеркавалі да Дня горада ў мінулым годзе. Праўда, размясцілі яго не зусім там, дзе знаходзілася сама вёска, а, хутчэй, там, дзе было зручна — каля ўваходу ў буйны магазін. На ўрачыстасці далі слова і той, дзякуючы каму ён з'явіўся.

Лілія Мяфодзьеўна адзначае, што ёй як дачцы ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны вельмі прыемна, што ў раёне шмат назваў прысвоены ў гонар герояў тых падзей: Якубоўскага, Адзінцова, Ляшчынскага, Бурдэйнага, Прытыцкага... Але гэта не значыць, што трэба забывацца пра іншыя складальнікі гісторыі — такія, як назва вёскі, якая доўгі час існавала на гэтым месцы. Станоўчы прыклад — той жа Зялёны Луг, які пачаў забудоўвацца крыху раней: рэальная гістарычная назва захавалася, што не перашкаджае існаванню вуліц, якія носяць імёны выдатных дзеячаў. Гэтае пытанне, калі праводзілася праектаванне вуліцы Цімашэнкі, яна паспела абмеркаваць і з прадстаўнікамі раённага ўпраўлення архітэктуры і будаўніцтва. Жанчына прапаноўвала новай частцы вуліцы прысвоіць назву якраз такі Бараноўшчына, бо вуліца Цімашэнкі і так дастаткова працяглая. Аднак такое рашэнне палічылі нерацыянальным, бо новыя вуліцы яшчэ будуць з'яўляцца і цалкам могуць атрымаць такую назву...

Так, могуць, але ж не атрымліваюць! І пакуль Бараноўшчына існуе толькі ў памяці гісторыкаў і неабыякавых да яе лёсу людзей — якраз для іх яна значыць занадта шмат, каб забыцца самім або дазволіць забыцца іншым. І, хто ведае, можа быць, гэта сапраўды толькі «першы камень»?

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

**P.S.**

*У адным з аддзелаў галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама, які займаецца арганізацыяй работы камісіі па найменні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складаных частак г. Мінска, нам паведамілі, што на вуліцы Бараноўшчына на цяперашні момант зарэгістравана 7 дамоў, таму няма і гаворкі аб вяртанні гэтай назвы — яна, маўляў, і так існуе. Да таго ж асабістыя прапановы камісіяй не разглядаюцца, яны павінны быць прадстаўлены альбо арганізацыяй, альбо па рашэнні мясцовага рэферэндуму. Такім чынам, нас перанакіравалі ў Нацыянальнае кадастравае агенцтва, дзе нам таксама паведамілі, што па стане на 28 лютага 2017 года ў Рэестры назваў вуліц і дарог у г. Мінску вул. Бараноўшчына мае месца. Аўтар гэтых радкоў нават спецыяльна яшчэ раз з'ездзіў на месца, каб на ўласныя вочы пераканацца: нічога там няма. Вось вам і «Мёртвыя душы» (дакладней, вуліца) на сучасны лад!*

АБМЯРКУЕМ

# БЕЗ МАШЫНЫ ЯК БЕЗ РУК

## Быць жанчынай, ездзіць на «жыгулях» і адчуваць сябе шчаслівай

**Аўтамабіль ужо даўно не раскоша, а толькі сродак перамяшчэння. Людзям розных прафесій машына дазваляе сэканоміць каштоўны час і зрабіць як мага больш спраў за працоўны дзень. Калі без аўтамабіля яшчэ можна справіцца ў буйных гарадах (па прычыне развітой транспартнай сеткі), то ў вёсках ён проста неабходны. Напрыклад, старшыня сельскага Савета проста фізічна не зможа абыходзіць усе населеныя пункты штодня. Напярэдадні 8 Сакавіка наш карэспандэнт пагутарыў з жанчынамі-кіроўцамі, якія стаяць на чале розных сельсаветаў. Аказалася, што замена кола, штурханне машыны і нават траплянне ў кювет — гэта для іх не надзвычайныя здарэнні, а будзённыя справы.**

**Старшыня Глыбачанскага сельскага Савета Ушацкага раёна Людміла ВЯЛЮГА** за рулём ужо больш за 10 гадоў. Па тэрыторыі сельсавета яна ездзіць на аўтамабілі ВАЗ-2107. Нягледзячы на механічную каробку перадач, з задавальненнем садзіцца за руль. Аднак службовы аўтамабіль ужо не новы, таму перыядычна ламаецца. На станцыю тэхабслугоўвання за 10 гадоў «жыгулі» трапілі толькі аднойчы, а ў астатні час з рамонтам дапамагалі муж і зяць. «Муж і парогі варыў, якія сталі падгніваць, і крылы мяняў, зяць таксама пераварваў і перафарбоўваў



аўтамабіль». З больш дробнымі непрыемнасцямі Людміла спраўляецца самастойна — яна з лёгкасцю можа замяніць кола або «прыкурыць» акумулятар.

**Старшыня Здзітаўскага сельскага Савета Бярозаўскага раёна Людміла ЭСАНАВА** за рулём ужо каля 14 гадоў. У 2012-м атрымала ў распараджэнне аўтамабіль «Лада Гранта», на якім за 5 гадоў праехала 76 тысяч кіламетраў. Механічная каробка перадач для яе не перашкода, хоць пасля «аўтамата» на асабістым аўтамабілі складана прывыкнуць да «механікі». Абслугоўваецца службовая машына фірменным сэрвісам, а дробнымі паломкамі займаецца муж.

Толькі аднойчы за ўвесь час за рулём у Людмілы Эсанавай адбыўся непрыемны інцыдэнт. «Трапіла ў кювет. Нічога не пабіла, а выцягнуць аўтамабіль дапамаглі сельскія жыхары, — расказала Людміла. — Як гэта адбылося? Загледзелася на бабулю, якая спрабавала распаліць вогнішча ў неналежным месцы». Больш са старшынёй Здзітаўскага сельсавета нічога падобнага не здаралася.

А вось **старшыня Немяржанскага сельскага Савета Драгічынскага раёна Анастасія САЛАВЕЙКА** ўжо шмат гадоў водзіць «Волгу» ГАЗ-31105. Звычайна не толькі жанчынам, але і мужчынам неабходны час, каб прывыкнуць да габарытаў машыны, аднак Анастасія з гэтым не згодная. «Я чалавек загартаваны, таму не бачу ніякіх складанасцяў. Таксама не бачу праблем з-за механічнай каробкі перадач. Я ніколі і не ездзіла на «аўтамаце», а да «механікі» прызвычаілася».

А вось **старшыня Багушэвіцкага сельскага Савета Бярэзінскага раёна Ларыса БАБІНОВІЧ** наогул лічыць, што лепш перакласці кіраванне на дужы пол. «Сёння жанчына павінна ўмець кіраваць аўтамабілем, — падкрэслівае Ларыса. — Але калі ёсць магчымасць ускласці гэты абавязак на мужчыну, то гэта не самае дрэннае рашэнне». Сама старшыня ездзіць на дзесяцігадовых «жыгулях» і за гэты час стала сапраўдным знаўцам тэхнічнай часткі аўтамабіля.

«Аўтамабіль павінен працаваць як гадзіннік, бо наша праца звязана з частым перамяшчэннем, — адзначае Ларыса. — Тэрыторыя майго сельсавета велізарная, ездзіць прыходзіцца шмат. Напрыклад, зімой правяраю, як у нас пачысцілі дарогі, а на недагледжанай машыне доўга не паездзіш». У дзень яна адольвае да 100 кіламетраў, аўтамабіль глядзіць пільна, аднак назваць ВАЗ-2107 ідэальным для жанчын нельга, падкрэслівае Ларыса.

«Жыгулі» называе складанай машынай і **старшыня Бабаўнянскага сельскага Савета Капыльскага раёна Ірына ЗАПОЛЬСКАЯ**. «Спачатку, шчыра кажучы, вельмі балелі рукі, бо цяжка круціць руль. Але зараз я ўжо прывыкла».

Машыну Ірына атрымала новую, і на працягу шасці гадоў яна практычна не падводзіла гаспадыню. «Аднак у адзін момант кузаў з'ела карозія, таму прыйшлося пераварваць аўтамабіль, — успамінае яна. — Вядома, мяняла расходнікі, аднак ніякіх прэтэнзій да машыны не ўзнікала». На яе думку, «нават «жыгулі» — гэта добры варыянт, бо ў некаторых сельсаветах у старшыняў няма аўтамабіляў наогул».

Усе нашы гераіні аднагалосна заявілі, што кіраванне для іх — сапраўднае хобі. Хоць іх службовыя аўтамабілі складана назваць камфортнымі і прыемнымі ў кіраванні. Жанчыны могуць самастойна зразумець, што і дзе стукае ў рухавіку, і нават аб розных здарэннях яны гавораць як аб звычайных выпадках на дарозе. Яшчэ б: кожная з іх штомесяц праязджае амаль 1000 кіламетраў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

# СКАРБЫ СЯРОД СМЕЦЦЯ

## Як камунальнікі Кобрына змагаюцца з адходамі

**Ідзеш на працу і — раз! — нібы мячык у кошык, кідаеш пакет са смеццем у кантэйнер... Для жыхароў Кобрына, дзе дамы не маюць смеццеправодаў, вынас адходаў — рытуал такі ж звыклы, як паход у краму. Каля 85 тысяч чалавек у раёне штогод адпраўляюць у «апошні палёт» прыкладна 35 тысяч тон згаданых пакецікаў. Але падарожжа смецця заканчваецца не тады, калі зачыняецца вечка кантэйнера. Што з ім адбываецца далей — расказваюць спецыялісты прадпрыемства «Кобрынская ЖКГ» і нашы карэспандэнты.**

### «Танцы» на самазвалах

Уладзімір Харламаў кіруе шматтонным грузавіком з упэўненасцю чалавека, які адпрацаваў на тэхніцы 34 гады. Пасля арміі ён уладкаваўся на аўтабазу, а потым перавёўся кіроўцам на ўчастак санітарнай ачысткі і добраўпарадкавання Кобрынскай ЖКГ. Вось і цяпер мы едзем забіраць чарговы груз у раён шматпавярховак. Жыхароў там многа, таму на пляцоўцы ўсталяваны вялікія дванаццацікубовы кантэйнер. Працэс загрузкі займае ад сілы хвілін пяць. З грузавіка на зямлю апускаецца пусты металічны бак, а на яго месца механічная «лапа» мультыліфта зацягвае напоўнены кантэйнер. З 17 машын гаспадаркі падобнае ноу-хау пакуль маюць тры.



На станцыі сартавання ўсё робяць уручную.

У паваротах Уладзімір упісваецца філігранна, хоць навічку тут давялося б папацець. Праезд, асабліва ў кварталах старой забудовы, вельмі вузкі, а тут яшчэ і ўладальнікі машын застаўляюць двары так, што да пляцоўкі са смеццем не падабрацца.

— Часам прыедзеш — і ўсё, застапарыўся, бо пакуль знойдзеш гаспадара машыны, пройдзе шмат часу. Раз'язджацца «ўпрытык»? Дык боязна пашкодзіць чужую маёмасць. — кажа Уладзімір. — Вырашаць праблемы такога кшталту вучышся з часам. Звычайна цяжкасці з праездам здараюцца ў больш старых раёнах. Каля новабудоўляў праекціроўшчыкі пакідаюць месца для манеўраў.

Па горадзе смеццявозы выязджаюць штодзень. У вёскі экіпаж з кіроўцы і грузчыка адпраўляецца раз на тыдзень. Калі вёсачка глухая і народу там жыве мала, то камунальнікі забіраюць кантэйнер па меры напаўнення адходаў — прыкладна адзін раз на месяц.

### Нас усіх трэба вучыць

На ўездзе на тэрыторыю ўчастка санітарнай ачысткі грузавік узважваюць. Напоўнены вялікі кантэйнер змяшчае 1,2 — 1,9 тоны бытавых адходаў, і ўсе яны становяцца часткай рознакаляровай гары, што высіцца перад станцыяй сартавання. Пра асобны збор смецця ў нас ведаюць нават дзеці, вось толькі па змесціве кантэйнераў гэтага не скажаш.

— Заўсёды ёсць 10 працэнтаў людзей, што сартуюць смецце і будуць рабіць гэта далей. Ёсць 10 працэнтаў, якіх не ўгаворыш на асобны збор ніякімі сіламі. А вось за астатнія 80 працэнтаў трэба змагацца, бо яны могуць памяняць сваё стаўленне, — кажа начальнік участка санітарнай ачысткі і добраўпарадкавання Анатоль Сацык. — І калі працэнт свядомых будзе расці, тады і нам будзе прасцей і хутчэй працаваць. Мы станем, умоўна кажучы, раскладваць пакеты па кучках, а не перабіраць змесціва кожнага.




Людміла ХАРЛАМАВА працуе тут кіроўцам.

Пакуль жа з кожнай тоны непатрэбных рэчаў работнікі станцыі выбіраюць прыкладна 13 працэнтаў другаснай сыравіны. Уся ж лінія сартавання ў Кобрыне разлічана на перапрацоўку да 5 тысяч тон смецця за год.

— Асобна збіраем небяспечныя адходы: напрыклад, людзі часта выкідваюць батарэйкі не ва урны, якія стаяць у крамах, а ў агульны кантэйнер. Ёсць на станцыі спецыяльныя месцы для лямпаў, што змяшчаюць ртуць, для адпрацаваных масел... Усё гэта мы здаём на прадпрыемствы, якія могуць іх бяспечна ўтылізаваць.

Тое, што не ўдаецца скарыстаць другі раз, хаваецца пад зямлю. Але вось што дзіўна: калі на станцыю сартавання прыязджаюць чатыры самазвалы, то ў бок палігона цвёрдых бытавых адходаў выпраўляецца толькі адна машына. Куды «выпараецца» астатняе смецце, тлумачыць Анатоль Сацык:

— Самазвалы прывозяць усе бытавыя адходы на станцыю сартавання, дзе з груза выбіраецца другасная сыравіна, а астатняе смецце спрэсоўваецца. Вось і маем, што смеццявоз, які ідзе ў бок палігона, адвозіць не 2 тоны адходаў, а 6 тон. Такім чынам мы эканомім прыкладна 35 літраў «саляркі» ў дзень. Памножце гэту лічбу на колькасць працоўных дзён за год, потым — на кошт дызельнага паліва, і атрымаецца лічба, большая за 10 тысяч рублёў.

### Месца, дзе ўсё знікае

На палігон цвёрдых бытавых адходаў каля вёскі Каташы выпраўляемся ў кампаніі Людмілы Харламавай, нявесткі Уладзіміра. У Кобрынскай ЖКГ дынастыі працаўнікоў не рэдкасць, але тут выпадак унікальны. Людміла выбрала прафесію кіроўцы, як свёкар і муж, і цяпер з'яўляецца ці не адзінай жанчынай у нашай краіне, якая займаецца такой працай. Прычым свой выбар зрабіла не пад уплывам абставін, а праз... покліч душы.

> Заўсёды ёсць 10 працэнтаў людзей, што сартуюць смецце і будуць рабіць гэта далей. Ёсць 10 працэнтаў, якіх не ўгаворыш на асобны збор ніякімі сіламі. А вось за астатнія 80 працэнтаў трэба змагацца.

— Бацька, які развозіў на самазвале будаўнічыя матэрыялы, часта браў мяне да сябе на работу. Так і заўважыла, што пазіраць на дарогу з кабіны грузавіка — захапляльна.

Людміла выйшла замуж, нарадзіла дзяцей і... у дэкрэтным водпуску атрымала жаданую катэгорыю. Потым прайшла стажыроўку на працы побач з мужам, а чатыры гады назад перасела на новенькі грузавік. Напачатку рэакцыя ў тых, хто бачыць жанчыну за рулём самазвала, бывае розная, ад «ну і малайчына!» да «яна, пэўна, з галавой не сябруе!». Але людзі прывыклі з часам, а начальства наогул ставіць яе ў прыклад іншым кіроўцам.

За размовай неўпрыкмет збочваем да Каташоўскага палігона. Па плошчы ён займае прыблізна 7 гектараў і для непадрыхтаванага назіральніка выглядае, бадай, страшнавата. Бульдозер раўняе слой смецця, які потым засыпаецца 20-сантыметровым слоем зямлі і г. д. Слаёны «бутэрброд» расце сярод лесу з канца 60-х гадоў. Анатоль Сацык мяркуе, што вялікую плошчу і аб'ём захаванага смецця можна скарыстаць з выгадай. Напрыклад, распрацаваць праект па здабычы метану, што ўтвараецца на такіх палігонах.

— Пакуль жа будзем трымацца больш жыццёвых планаў, — лічыць ён. — Мы пастаянна кантактуем з Маларыцкай, Жабінкаўскай, Драгічынскай, Пружанскай жыллёва-камунальнымі гаспадаркамі. Дзелімся навінкамі, абменьваемся вопытам. У некаторых суседзяў лініі сартавання пакуль няма, але яны ўжо могуць ацаніць, наколькі эканамічна выгадна яе выкарыстанне. Наогул, нашу работу нехта можа палічыць спецыфічнай, але ж яна патрэбная, карысная.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

Уладзімір ХАРЛАМАЎ выгружае сабранае смецце.

У ТЭМУ

## МІНПРЫРОДЫ СПРАШЧАЕ ЎМОВЫ

**Першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА,** у прыватнасці, адзначыла, што цяпер у іх ведамстве плануецца скараціць пералік адміністрацыйных працэдур, у першую чаргу ў галіне нетракарыстання і абыходжання з адходамі. «Мы зараз актыўна працуем з індывідуальнымі прадпрымальнікамі, каб палегчыць ім працэдуру ўзгаднення інструкцый па абыходжанні з адходамі», — удакладніла пазіцыю міністэрства Ія Малкіна.

Таксама цяпер эксперты міністэрства аналізуюць, ці магчыма адмовіцца ад ліцэнзавання, якое ў нас ажыццяўляецца па двух напрамках — абыходжанне з адходамі і азонаразбуральныя рэчывы. «Неабходна прааналізаваць нашы міжнародныя абавязацельствы, у першую чаргу ў ЕАЭС, каб вызначыць, наколькі мы можам у аднабаковым парадку змяніць тыя ці іншыя працэдуры», — растлумачыла першы намеснік міністра.

Акрамя таго, спецыялісты Мінпрыроды займаюцца сёння вывучэннем тэхнічных нарматыўна-прававых актаў, якія рэгулююць розныя напрамкі: ахову азонавага слоя, аднаўляльныя крыніцы энергіі, абыходжанне з адходамі, ахову атмасфернага паветра, ахову і выкарыстанне вод. «Мы прааналізавалі, у якіх тэхнічных нарматыўна-прававых актах ёсць абавязковыя патрабаванні, а ў якіх добраахвотныя. Зараз плануем вывучыць, наколькі неабходна з пункту гледжання выканання міжнародных абавязацельстваў выканаць абавязковыя патрабаванні. Добраахвотныя застануцца нязменнымі», — цытуе Ію Малкіну БЕЛТА.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Кіроўца, трымайся за руль!

**У сувязі з надыходам міжсезоння Дзяржаўтаінспекцыя просіць быць як мага больш уважлівымі на дарогах.**

«Ужо не рэдкія дажджы, якія ўсё яшчэ могуць змяняцца снегападамі. Такія сюрпрызы надвор'я значна ўплываюць на стан праезнай часткі — пагаршаюць бачнасць у кірунку руху.

Дзяржаўтаінспекцыя просіць кіроўцаў быць як мага больш уважлівымі, выбіраць хуткасць руху з улікам стану праезнай часткі і бачнасці, не рабіць неабдуманых манеўраў, быць асабліва пільнымі ў месцах магчымага з'яўлення на дарозе пешаходаў і веласіпедыстаў: з-за размытых абочын апошнія перасоўваюцца па праезнай частцы. Пешаходам і веласіпедыстам абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі, выконваць правілы бяспечнага перасячэння праезнай часткі», — паведамляецца на сайце Міністэрства ўнутраных спраў.

Работа асабовага складу дарожна-патрульнай службы ДАІ арыентавана на аказанне дапамогі ўдзельнікам дарожнага руху і гарантаванне бяспечных умоў руху.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «АБЫЯКАВАСЦЬ — ГЭТА ХВАРОБА»

## Так лічыць старшыня Мазырскага раённага Савета дэпутатаў

**Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні адзіны для ўсёй краіны. Ён вызначае структуру, прынцыпы фарміравання і паўнамоцтвы мясцовых Саветаў, але некаторыя тонкасці не прадугледзіш афіцыйнымі дакументамі. У кожным раёне дыялог паміж грамадзянамі і ўладай складваецца ў залежнасці ад мясцовага менталітэту, традыцый, эканамічнай сітуацыі і нават геаграфічнага становішча. Сваім вопытам у гэтай справе з чытачамі «МС» дзеліцца старшыня Мазырскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ГВОЗДЗЬ. Ён расказаў, чаму Мазыр — асаблівы для Палесся горад, што такое культура працы і чаму абыякавасць — хвароба.**



**— У чым адметнасць Мазыра ў параўнанні з іншымі палескімі гарадамі? Чым ён асаблівы?**

— Наш горад некалі быў абласным цэнтрам. І дагэтуль яго называюць «сталіцай» Палесся. Для жыхароў палескага краю ён сапраўды цэнтр «прыцягнення». Тут працуюць арганізацыі, што забяспечваюць жыццядзейнасць адразу некалькіх раёнаў. Жыхары Калінкавічаў, Ельска, Петрыкава, Нараўлі, Лельчыц, Хойнікаў, а таксама вяскоўцы прыязджаюць да нас па медыцынскае абслугоўванне. Або завітваюць на выхадныя, бо тут добра развіты гандаль і сфера абслугоўвання. Юнакі і дзяўчаты імкнуцца ў Мазыр па адукацыю: у нас ёсць універсітэт, музычны, медыцынскі, політэхнічны каледжы і іншыя навучальныя ўстановы. А многія спецыялісты, жывучы ў суседніх раёнах, ездзяць сюды на працу.

**— Карціна вымалёўваецца прыгожая. Але ж у Мазырскага раёна, напэўна, ёсць і свае праблемы?**

— Праблемы ўсюды аднолькавыя, але праяўляюцца па-рознаму. Самае актуальнае — эканоміка. Калі яна будзе развівацца — будуць зарплаты ў людзей і дабрабыт у рэгіёне. А Мазыр — горад прамысловы. Магу сказаць, што якасць тутэйшай прадукцыі радуе. І не толькі Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, «Беларускабеля» або «Мазырсолі». Добра працуе сельская гаспадарка, харчовая, лёгкая прамысловасць. Але вырабіць — гэта палова справы. Трэба ўмець прадаваць. Не пакажаш сваю прадукцыю, не прапіярыш — ніхто яе ведаць не будзе. Таму трэба ўкараняць новыя тэхналогіі, эканоміць энергарэсурсы, закрываць неперспектыўныя лініі — словам, зніжаць сабекошт. А што трэба павысіць — дык гэта культуру працы.

**— Што вы маеце на ўвазе пад «культурай працы»?**

— Ёсць у нашага менталітэту рыса: над кожным трэба ставіць наглядчыка, каб кантраляваць якасць выканання. Але надышоў час ужо гэта «перарасці». Культура працы — калі кожны разумее, што ад яго таксама залежыць поспех усяго прадпрыемства. Сёння «схалтурыў», зрабіў дэталь няякасна, а заўтра да пакупніка трапіць прадукт з бракам. І ўсё, рынак страчаны. Дык ці варта дзівіцца, што зарплата ў цябе не такая, як хацелася б? Затое краіны, дзе выхоўваецца адказнае стаўленне да працы, дасягаюць поспехаў. Яскравы прыклад — Японія ці Германія. На жаль, падчас выездаў на прадпрыемствы мы дагэтуль выяўляем факты нядбайнасці, неналежнага выканання сваёй працы.

**— Як часта вы самі бываеце на прадпрыемствах, гутарыце з людзьмі?**

— Рэгулярна. Нашы дэпутаты ўваходзяць у склад інфармацыйна-прапагандысцкай групы, якая ездзіць па прадпрыемствах раёна. Мы таксама ладзім сустрэчы з жыхарамі сельсаветаў. На іх прысутнічаюць дэпутаты першаснага ўзроўню, а таксама ўпаўнаважаныя ад кожнага населенага пункта. Клічам туды і кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета. А таксама тых, што маюць шэфства над населенымі пунктамі. І запрашаем усіх жыхароў, якія хочуць папрысутнічаць. І старшыня Савета дае справаздачу выбаршчыкам і дэпутатам, адказвае на праблемныя пытанні. Цікава, што ў шэрагу выпадкаў для іх вырашэння не трэба вялікіх грошай. Варта проста своечасова звярнуць на іх увагу.

**— Дэпутат Мазырскага раённага Савета — хто ён? Які яго сацыяльны партрэт?**

— Нашы дэпутаты — вельмі розныя людзі. Гэта прадстаўнікі прамысловасці, адукацыі, медыцыны, маладзёжных арганізацый, ветэраны і г. д. Адрозніваюцца яны і сацыяльным статусам: кіраўнікі, рабочыя, пенсіянеры. Агульнае тое, што іх ведаюць у горадзе, ім давяраюць людзі. Яны разумеюць абстаноўку, умеюць даносіць інфармацыю да выбаршчыкаў. А гэта вельмі важна, бо ёсць сілы, што любую праблему імкнуцца выкарыстаць як нагоду для дэстабілізацыі грамадства.

«У кожным раёне дыялог паміж грамадзянамі і ўладай складваецца ў залежнасці ад мясцовага менталітэту, традыцый, эканамічнай сітуацыі і нават геаграфічнага становішча.»

**— Як дэпутаты працуюць з выбаршчыкамі? Ці ўдаецца людзям «дастукацца» да сваіх прадстаўнікоў?**

— Я магу доўга расказваць пра графікі прыёму, пра звароты і г. д. Гэта ўсё ёсць. Але да любога з нашых дэпутатаў можна звярнуцца ў любы момант. І ніхто не скажа: «Выбачайце, але ў мяне сёння непрыёмны дзень!» Раз ты ўзяў на сябе абавязкі — выконвай. І не абяцай таго, чаго не можаш зрабіць. Бо пустыя абяцанкі падрываюць давер да прадстаўнічай улады.

**— А з якімі праблемамі прыходзяць выбаршчыкі?**

— У сельскай мясцовасці людзей хвалюе добраўпарадкаванне. Каб не буяла пустазелле, каб своечасова высякалі кустоўе. Мы парабілі вечкі для калодзежаў, вырашылі праблему вывазу смецця, размясцілі ў вёсках кантэйнеры для бытавых адходаў. Цяпер у раёне няма колішніх стыхійных сметнікаў. Хаця складанасці застаюцца. У прыватнасці, людзей хвалюе якасць пітной вады. І мы вырашаем гэту праблему па меры сіл і сродкаў: прамываем водаправоды, мяняем старыя трубы, чысцім ад іржы воданапорныя вежы.

Або яшчэ адзін прыклад: у аграгарадку аддзяленне банка працавала толькі два дні на тыдзень. Людзі звярнуліся да дэпутата, той — да кіраўніцтва ўстановы. І яно пайшло людзям насустрач. Здавалася б, дробязь. Але з такіх дробязяў і складаецца камфортнае жыццё.

Гараджан жа больш хвалююць пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі, работы грамадскага транспарту, развіцця гандлю. Каб рэагаваць на надзённыя праблемы больш аператыўна, у 10 мікраёнах Мазыра створаны камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Праз іх самі гараджане наводзяць парадак у дварах, займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі і г. д. Пры камітэтах ёсць грамадскія прыёмныя, у рабоце якіх удзельнічаюць і дэпутаты. Усё гэта дапамагае зменшыць «вал» пісьмовых зваротаў. Улада мусіць непасрэдна размаўляць з людзьмі.

Але важна не заахвочваць утрымальніцтва. Каб не было так, што я ляжу на канапе, а нехта за мяне ўсе праблемы вырашае.

**— Саветы дэпутатаў атрымалі паўнамоцтвы вызваляць грамадзян ад падатку на «дармаедства». Ці даводзілася вам разглядаць падобныя звароты?**

— Я асабіста ўваходжу ў склад працоўнай групы, якая гэтым займаецца. Сам дэкрэт лічу вельмі правільным, бо ён накіраваны супраць сацыяльнага паразітызму. І ў той жа час дазваляе не стрыгчы ўсіх пад адзін грэбень, а разбірацца ў канкрэтнай сітуацыі. Вось, напрыклад, малады хлопец кажа, што не працуе, бо хворую маці даглядае, і просіць вызваліць ад падатку. А высвятляецца, што маці сама каго хочаш дагледзіць і гультая-сына забяспечвае. А ў яго няма ніякіх амбіцый, памкненняў. Яму не патрэбны ні кар'ера, ні грошы, ні самарэалізацыя. Абы пражыць дзень да вечара. Як кажуць, млявасць і абыякавасць да жыцця. А абыякавасць страшнейшая за любыя эканамічныя праблемы. Яна нібы хвароба, якая адбівае жаданне развівацца, нечага дасягаць. Таму мы заўсёды заклікаем: не будзьце абыякавымі! Ні да іншых, ні да сябе!

**Валянцін БОЙКА.**
*boika@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел: + 375 (214) 41-72-95, тел./факс 41-80-30 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, а также запасы (сырье, материалы, инвентарь), реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54Б

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Бытовое здание** | Здание административно-хозяйственное | 55,5 кв. м | 250/С-36285 |
| **Бытовое здание кладовщика** (в т.ч. терасса) | Здание административно-хозяйственное | 14,3 кв. м | 250/С-36290 |
| **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 19,9 кв. м | 250/С-36287 |
| **Гараж №2** | | 21 кв. м | 250/С-36291 |
| **Профилакторий для автомашин, склад** | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей | 782,3 кв. м | 250/С-36286 |
| **Канализационная сеть** | Сооружение специализированное водохозяйственного назначения | - | 250/С-39742 |
| **Тепловая сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | - | 250/С-39970 |
| **Склад с мастерскими** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 693 кв. м | 250/С-36289 |

**Составные части принадлежности**: две пристройки, рампа, ограждение (кирпичное, сборные железобетонные плиты), ворота

**С перечнем оборудования, прочих основных средств, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь) и временных сооружений, входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Обременения** | **Частичная аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона** www.cpo.by |

**Начальная цена с НДС 20% –223 888,05 белорусского рубля BYN**

| | |
|---|---|
| **Шаг аукциона** | **11 194,40 белорусского рубля BYN** |
| **Сведения о земельном участке** | Для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 2,0897 га. Обременения: охр. зона систем газообеспечения и др. линейных инженерных сооружений, площадь 0,0390 га; охр. зона ЛЭП, напряжением свыше 1000 В, площадь 0,2460 га |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Тукиш Валентина Евгеньевна, завхоз, контактный телефон МТС (+37533) 346-50-90 |

**Лот №2**

Имущество, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12В, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Питомник служебного собаководства** | Здание специализированное животноводства | 191,2 | 250/С-33936 |

**Составные части и принадлежности:** вольеры для собак, навес для приготовления пищи собакам, служебное, 2 навеса, забор (деревянный, железобетонные плиты, металлическая сетка), 2 ворот, калитка, дворовое покрытие

В состав лота входит часть ж/б забор (22 шт. ж/б плиты)

**Начальная цена с НДС 20% – 18 108,00 белорусского рубля BYN**

| | |
|---|---|
| **Шаг аукциона** | **905,40 белорусского рубля BYN** |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания здания питомника служебного собаководства предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,3237. Обременения: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, площадь 0,0240 га |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон: МТС +37533-677-45-09 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** Не более **30** (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 "О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица". К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 18.01.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **24.03.2017 в 13.00 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.03.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |



Вниманию акционеров

**ОАО «Белсолод»**

**15 марта 2017 г.** по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32 состоится очередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания – 13.00. Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 12.00 до 12.55. Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – также доверенность или договор). С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 7 марта в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белсолод» в 2016 году и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Белсолод» за 2016 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2016 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Белсолод». Ознакомление Общества с заключением аудиторов.
4. Утверждение годовых отчетов, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2016 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2016 год. О выплате дивидендов за 2016 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Белсолод» на 2017 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Белсолод».
8. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

УНП 200075434

Наблюдательный совет

# НОВАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ,

## або Як цяперашняе пакаленне змяняе офісную прастору

**Капсулы для сну, настольны тэніс і здаровае харчаванне ўжо гатовы прапанаваць некаторыя кампаніі сваім супрацоўнікам у Беларусі. А на Захадзе каля 10% арандатараў офісаў сярэдняга памеру выкарыстоўваюць віртуальныя працоўныя месцы. То-бок працаваць у вялікай міжнароднай кампаніі становіцца магчымым, нават седзячы ў вёсцы ці на хутары — быў бы інтэрнэт. Мы пастараліся ўявіць, куды вядуць сучасныя тэндэнцыі камерцыйную нерухомасць і як у сувязі з гэтым будзе мяняцца выгляд нашых населеных пунктаў.**

### Змена пакаленняў

Горад будучыні павінен быць разумным. Ён амаль на сто працэнтаў рэалізуе наш попыт і з'яўляецца авангардам культуры. Спрагназаваць, што спатрэбіцца новым супрацоўнікам, можна, калі прааналізаваць парадыгму пакаленняў.

Пасля Другой сусветнай вайны сфарміравалася пакаленне «бэбі-бумераў» (1945—1960), якія арыентаваліся на аднаўленне разбураных гарадоў. Яны ўпарта працавалі і былі не вельмі распешчаны ў тэхналагічным дачыненні. Менавіта бэбі-бумеры пажадалі, каб на працы існавала кабінетная сістэма, каб ніхто не перашкаджаў засяродзіцца і каб існавала жорсткая іерархія. У гэтага пакалення ёсць выразны падзел: дом, праца, адпачынак. Гэтыя сферы не змешваюцца, таму існуе такі ж строгі падыход да падзелу гарадскога асяроддзя.

Наступнае пакаленне X (1961—1980) адмаўляла шэраг каштоўнасцяў сваіх бацькоў. У свеце з'явіліся першыя персанальныя камп'ютары, у людзей пашырыўся кругагляд. Для іх працагалізм быў ужо не прымальны — больш важны баланс сям'і, адпачынку і працы. Іерархічная сістэма пахіснулася.



Так выглядае офісная капсула сну.

Пакаленне Y (1981—1995), або міленіуму, у прынцыпе не прымае існуючую сістэму. Яно не збіраецца падладжвацца пад працу, хай праца падладжваецца пад яго. Для гэтага пакалення непрымальная жорсткая сацыяльная іерархія, яно прызнае толькі харызматычны тып лідарства: хай кіруе той, хто лепш ведае і можа гэта даказаць. Менавіта пакаленне Y перавабжае цяпер на рынку працы. Прастора становіцца больш нефармальнай, а праца ператвараецца ў месца рэалізацыі сябе. Работа, адпачынак і іншыя сферы пачынаюць увасабляцца ў рамках адзінай прасторы. У пакалення Y ёсць цікавая асаблівасць: яны не хочуць жыць без бацькоў да 30—35 гадоў. Таму іх яшчэ называюць «пакаленнем Пітэра Пэна».

Пакаленне Z (народжаныя пасля 1995) вырастае на інтэрнэце і сацыяльных сетках. Яно жыве ў асяроддзі шматзадачнасці. Гэта пакаленне арыентаванае на цалкам мабільныя сродкі зносін з людзьмі, яму персанальны камп'ютар ужо не патрэбен.

Моцна ўкараняюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, і ўсё мяняецца кардынальна.

### Эканомія часу — найважнейшая задача

Разам са зменай пакаленняў адбываецца эвалюцыя офіснай прасторы, таму што кожны хоча працаваць з камфортам. Раней былі адкрытыя памяшканні на заводскай тэрыторыі, потым — кабінеты, якія існуюць і цяпер. У 1980-х адбылася пэўная рэвалюцыя ва ўспрыманні офісаў: людзям пачалі прапаноўваць не бетонныя скрыні, а паслугі, што называецца, сэрвіс-офіс. Гэта адна з краевугольных ідэй у разумных горадзе ў кантэксце таго, якія існуць патрэбы ў сучаснага і будучых пакаленняў. У 2006 годзе пачалі з'яўляцца каворкінгі (калектыўныя офісы), потым кампусы з чыста ўніверсітэцкага паняцця ператварыліся ў папулярную форму арганізацыі бізнес-асяроддзя, дзе ў людзей ёсць усё.

— Узнікае імітацыя гарадскога асяроддзя ў межах камерцыйнай нерухомасці. І сёння гэта тэндэнцыя паглыбляецца, — адзначае дырэктар дэпартамента кансалтынгу і даследаванняў Colliers International Дзяніс Чацверыкаў. — З прыходам пакаленняў Y і Z змянілася само разуменне прасторы. Раней людзі бралі партфель і ў панядзелак ішлі на працу. Сёння многія працуюць дома. Зараз офіс — гэта не месца працы, а месца рэалізацыі сябе як асобы. Смарт-сіці — гэта нарастанне складанасці, таму офіс тут шматгранны. У ім ёсць сацыяльная і гульнявая інфраструктуры, харчаванне... Мы прапануем некаторым рабіць капсулы для сну. У многіх гэта выклікае лёгкі смех. Але ў нас моцная IT-сфера, дзе ўзрост дакладна вызначаны: 25—30 гадоў, пакаленне Y. Яны не хочуць мець фіксаваныя працоўныя гадзіны.

Сёння эканомія часу выходзіць на першае месца. Людзі на працы хочуць жыць: кантактаваць, адпачываць, спаць, есці... Мяняецца падыход да офіснай прасторы. Многія працоўныя пытанні нават на беларускім рынку вырашаюцца ўжо ў рэстаранах. Досыць прававерна прымаць нефармальныя зносіны як новую рэальнасць. Наўздагон з'яўляюцца дадатковыя патрабаванні: душ, велапаркоўка, кухня. І глабальна гэта распаўсюджваецца на ўвесь будынак і ўсё, што вакол. Узнікае цэнтр прыцягнення. Людзі цікавяцца, дзе тут фітнес, басейн, дзе дзіця пакінуць, пастрыгчыся... Яны мяняюць бізнес-цэнтр у цэлым.

Сучасны офіс не павінен быць у цэнтры горада. Ёсць такое паняцце, як «чалавечае воблака» (human cloud). Супрацоўнікі ўяўляюць з сябе сетку: яны звязаны паміж сабой праз інтэрнэт ці праз іншыя сродкі. Ім няма сэнсу ехаць у цэнтр горада, таму што пакаленні Y і Z, як правіла, жывуць у спальных раёнах і не жадаюць стаяць у заторах і марнаваць час. Офіс павінен адпавядаць іх патрэбам. Інакш людзі не паспяваюць жыць.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*


Вниманию акционеров

**ОАО «Белгорхимпром»!**

Собрание акционеров состоится **31 марта 2017 года в 11.00** по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2016 год и основных направлениях деятельности в 2017 году.
2. Отчет ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2016 год.
3. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2016 году.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2016 год.
5. О распределении прибыли и убытков.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об определении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О внесении изменений в устав ОАО «Белгорхимпром».

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, каб. №407) в рабочие дни в период с 17 по 30 марта 2017 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании – в день проведения собрания **с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3-й этаж)**. При себе иметь следующие документы: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность

УНП 600024712

**31 марта 2017 г. в 9.30**

по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1,

состоится очередное Общее собрание акционеров

**ЗАО «Возвышенность».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 г.
2. Утверждение отчета Наблюдательного совета за 2016 г.
3. Отчет ревизора за 2016 г.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности, счетов прибыли и убытков, распределение прибыли и убытков Общества за 2016 г.
5. Избрание членов Наблюдательного совета.
6. Избрание ревизора Общества.

С документами, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1, с 9.00 до 18.00 ежедневно, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней с предварительным телефонным уведомлением.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая, карточками, изготовленными из бумаги с указанием количества голосов.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании участников Общества, будет проводиться с 8 часов 40 минут до 9 часов 25 минут в день и по месту проведения собрания. При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

ЗАО «Возвышенность», г. Минск, пр-т Независимости, 16, ком. 1

УНП 100088694

Уважаемые акционеры

**ОАО «Обувьторг»**

**30 марта 2017 года** в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 28, состоится общее собрание акционеров!

Начало собрания – 14.00.

Регистрация участников проводится с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и перспективах развития Общества на 2017 год.
2. О работе наблюдательного совета ОАО «Обувьторг» в 2016 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах аудиторской проверки Общества за 2016 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Обувьторг» за 2016 год.
5. Об утверждении распределения чистой прибыли за 2016 год.
6. О выплате дивидендов за 2016 год.
7. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2017 году и I квартале 2018 года.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Обувьторг».
9. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
10. Об утверждении Устава ОАО «Обувьторг» в новой редакции.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни, начиная с 23 марта 2017 года по месту нахождения Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра на 1 марта 2017 года.

УНП 100262652 Наблюдательный совет



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 28 лютага 2017 года.**

■ Псіхалогія для ўсіх

# РАЗБУРАЛЬНАЕ РАТАВАННЕ

### У залежных ёсць права набіваць свае шышкі, але сузалежныя перашкаджаюць ім у гэтым



Так бывае, калі партнёр па шлюбе, дзіця, маці, сябра залежыць ад хімічных рэчываў, алкаголю, наркотыкаў або пакутуе ад гульнявой, харчовай, сексуальнай, рэлігійнай, любой залежнасці, а вы, у сваю чаргу, залежыце ад гэтага чалавека і, вядома, кідаецеся яго ратаваць. Робіце замест яго нейкія справы, выцягваеце з даўгоў, корміце, апранаеце. Гэта не цэніцца, больш за тое, вас пачынаюць абвінавачваць у тым, што з-за вас чалавек і трапіў у гэту залежнасць і не можа з яе выбрацца. Што вельмі важна, у нейкім сэнсе так і ёсць. Калі ў вашым жыцці існуюць стасункі, якія вас стамляюць, вымотваюць, з'яўляюцца крыніцай пастаяннага напружання і выхаду з іх не бачна, то, хутчэй за ўсё, вы трапілі ў шарэнгі сузалежных.

— У такія стасункі трапляюць людзі пэўнага складу — тыя, хто прывык апякаць, кантраляваць, непакоіцца пра іншых больш, чым пра сябе, — расказвае **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ганна МІКУЛА.** — Гэта людзі, якіх звыш меры апякалі ў дзяцінстве. Або, наадварот, іх кідалі, і яны такім чынам імкнуцца даць іншым тое, чаго самі ніколі не мелі. У выніку яны пакутуюць самі, не могуць пабудаваць дарослыя давяральныя стасункі і мімаволі не даюць стаць дарослымі свайму дзіцяці, мужу і г. д. Яны падтрымліваюць у тым, з кім знаходзяцца ў сузалежнасці, паводзіны ахвяры кожны раз, калі спрабуюць зрабіць ім добра. А як толькі спрабуюць адысці ў бок, то перажываюць велізарнае пачуццё віны за тое, што «кінулі», не дапамаглі, не збераглі... Але насамрэч ніякай іх віны ў гэтым няма. Чалавек павінен сам захацець пазбавіцца ад залежнасці, што магчыма толькі тады, калі з'явіцца паўнавартасная замена «сумніўнаму задавальненню».

У сузалежных ёсць патрэба пакутаваць. Карані яе, як правіла, у дзяцінстве: «дрэнная дзяўчынка — дрэнная жонка, мама», якая не заслугоўвае шчасця ў жыцці, якая абавязана клапаціцца пра іншых замест сябе. Самае лепшае, што можна зрабіць для блізкага чалавека — пачаць пражываць уласнае шчаслівае і паспяховае жыццё, быць моцнай асобай, не баяцца памыляцца і дзейнічаць, прызнаваць свае памылкі і выпраўляць іх, урэшце, атрымліваць радасць ад жыцця, нягледзячы ні на якія цяжкасці. Адэкватна ацэньвайце і паважайце выбар іншага чалавека, нават калі гэта «разбурэнне». Мець магчымасць рабіць свае памылкі, набіваць свае шышкі, каб не было каго пасля ў гэтым вінаваціць — важная частка сталення. Як бы вы ні любілі сваіх блізкіх, ад ахвярных паводзін не толькі не будзе карысці, але будзе адваротны эфект.

Неабходна фарміраваць зону любові да сябе, пачуццё ўласнай годнасці, шукаць крыніцы задавальнення не толькі ў клопаце пра іншых, але і аб сабе. Прыгадаць, што радавала ў дзяцінстве і юнацтве, аднавіць гэтыя заняткі, паспрабаваць штосьці новае. Гэта можа быць што заўгодна: танцы, літаратура, кулінарыя, дызайн... Не стаўце невераготных мэты, няхай гэта будзе пакуль прыемна праведзены час.

Нават пры разгерметызацыі салона самалёта кіслародную маску перш за ўсё трэба надзець на сябе і толькі пасля на дзіця. Калі вы ўмееце ў сваім жыцці рабіць выбар на карысць шчасця, то і ваш блізкі чалавек мае магчымасць у вас навучыцца. Спыніце яго ратаванне — і тады сапраўды атрымаеце шанц ратаваць і сваё жыццё, і яго. І не адкладвайце перамены на паслязаўтра, пачніце змены сёння. А калі нічога не атрымліваецца, прыходзьце да спецыяліста ■

■ Не на карысць

# ОЙ, ГАРАЧАЕ!

**Слізістая стрававода не прыстасавана да надта гарачай ежы, як і да вельмі халоднай. Пашкоджанне эпітэлію можа прывесці нават да анкалогіі.**
**Надта гарачая ежа здольная апячы стрававод. Узнікне ацёк яго тканак, парушыцца глытанне, пасля пачне адміраць тканка, і з'явяцца язвы, пасля зажыўлення якіх сфарміруецца звужэнне стрававода.**



Паводле слоў **урача-хірурга 24-й гарадской паліклінікі спецмедагляду Марыны КУРЖАНСКАЙ**, небяспека заключаецца ў тым, што ў выніку апёку гарачай ежай або вадкасцю сфарміруецца рубец, што знізіць праходнасць стрававода. Гэта пагражае недаяданнем, сепсісам, пнеўманіяй, трахеабранхітам, ларынгітам. Пры апёку чацвёртай ступені трахеабранхіяльнага дрэва і стрававода можна загінуць. Асабліва небяспечна даваць гарачую ежу дзецям, у якіх нават невялікія апёкі слізістых стрававода, глоткі, гартані або ротавай поласці здольны прывесці да парушэння дыхання і звужэння гартані, што небяспечна для жыцця.

Паводле даследаванняў вучоных, ужыванне моцна гарачых напояў (тэмпературай каля 70 градусаў) і ў вялікай колькасці (звыш 1 л у дзень) можа выклікаць рак стрававода. Пакутуюць, дарэчы, і зубная эмаль, і слізістыя рота. Калі пастаянна апякаць рот, гэта аслабляе мясцовы імунітэт і павышае верагоднасць развіцця якой-небудзь інфекцыі. Пашкоджваюцца гарачай ежай і смакавыя рэцэптары, што прыводзіць да страты адчування смаку.

Гарачая ежа і засвойваецца нашмат хутчэй. Ежа пакідае страўнік і трапляе ў кішэчнік хутчэй, чым належыць, у выніку чаго арганізм не паспявае атрымаць насычэнне. Адчуванне голаду штурхае да пераядання. Так што пазбягайце ўжывання халоднага газіраванага напою з гарачым гамбургерам.

Большасць хворых на рак стрававода і гартані, калі выключыць курцоў і тых, хто злоўжывае алкаголем, — аматары вельмі гарачых напояў.

Тэмпература вадкасці не павінна перавышаць 60 градусаў. Дайце ежы астудзіцца, піце дробнымі глыткамі і павольна. Вазьміце на ўзбраенне народны метад вызначэння аптымальнай для сябе тэмпературы. Калі можаце трымаць у руках кубак з чаем, значыць, і напой ужываць можна ■

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ОАО «НЕРУДПРОМ», г. Минск, ул. Асаналиева, 72 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| № лота | Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| 1 | **Квартира** | 40,8 кв. м | 600/D-89149 | Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Зеленая, 1В-99 |
| Начальная цена лота №1 без НДС – **72 772 руб. 34 коп.** (снижена на 5%) | | | | |

| ***Транспорт и спецтехника*** | | |
|---|---|---|
| № лота | Наименование | Инв. номер по бухучету |
| 2 | **Автомобиль МАЗ 500А, гос. номер КА 7474, г.в. 1978** | 7474 |
| Начальная цена лота №2 с НДС **– 4 408 руб. 15 коп.** (снижена на 5%) | | |
| 3 | **Трактор МТЗ-82Л, гос. номер 7485 ОА, г.в. 1979** | 3585 |
| Начальная цена лота №3 с НДС **– 6 171 руб. 41 коп.** (снижена на 5%) | | |
| Месторасположение лотов №2 и №3 – Минский р-н, Петришковский с/с, р-н д. Захаричи, ДСЗ «Заславль» | | |
| 4 | **Автомобиль МАЗ 55514 020, гос. номер KI 4543, г.в. 2002** | 4345 |
| Начальная цена лота №4 с НДС **– 9 091 руб. 82 коп.** (снижена на 5%) | | |
| 5 | **Автокран Краз 250, гос. номер 4186 МИН, г.в.1991** | 4186 |
| Начальная цена лота №5 с НДС **– 18 514 руб. 24 коп.** (снижена на 5%) | | |
| Месторасположение лотов №4 и №5 – г. Минск, ул. Асаналиева, 72 | | |
| 6 | **Трактор МТЗ-82 1, гос. номер КА-7 0409, г.в. 2002** | 3993 |
| Месторасположение лота №6 – Минский р-н, Петришковский с/с, д. Большая Воловщина, ПСХ «Колос» | | |
| Начальная цена лота №6 с НДС **– 12 862 руб. 79 коп.** (снижена на 5%) | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.12.2016

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 17.03.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 15.03.2017 до 17.00** по указанному адресу.
Тел.: +375 17 280-36-37; (8029) 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by



## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает об открытом аукционе по продаже Административного помещения, г. Минск, ул. Алибегова, 16, 1Н

| **Наименование** | **Начальная цена продажи, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** |
|---|---|---|
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №500/D-689786. Наименование: административное помещение. Г.п. – 2005. Этаж – 1. Общая площадь – 173,3 кв. м. Стены наружные и внутренние – ж/бетонные панели. Перегородки – гипсобетонные. Перекрытия – ж/бетонные. Проемы оконные – стеклопакеты. Проемы дверные – щитовые. Балконы – есть. Отопление – центральное. Водопровод, канализация – есть. Горячее водоснабжение – есть. Ванные – есть. Электроснабжение – скрытая проводка. Радио, телефон – есть | 279 720,00 | 27 970,00 |

Шаг аукциона – 5%

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 03.04.2017 в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Адм. помещение) (Лот №1), проводимом 03.04.2017 (Фрунзенский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6, в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00.
Окончание приема заявлений – 30.03.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Грабовский Александр Александрович, тел. +375-29-640-28-48

**☎ Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**



УНП 300042199

## ОАО «Нафтан»

**реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов, аппарат для дублирования, 30.03.2017 | Аппарат для дублирования GELOVIT 200 | 06253534 | 2009 | 1 214,00 |
| Реализация неликвидов, 30.03.2017 | Машина посудомоечная ММТУ-2000 | 06270689 | 2007 | 1 669,00 |
| | Машина посудомоечная ММУ-2000 | 06270690 | 2007 | 1 669,00 |
| | Машина посудомоечная МПУ-700 | 06270693 | 2007 | 402,00 |
| | Машина посудомоечная МПУ-700 | 06270694 | 2007 | 402,00 |
| | Фризер для мороженого | 06270695 | 2007 | 380,00 |
| | Электроплита ПЭ-0,17 | 06270697 | 2007 | 380,00 |

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 30 марта 2017 года с пометками на конверте, указанными в таблице.

**Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, (033) 398 07 67**



## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже капитального строения по адресу: д. Острошицкий Городок, участок №92

ОПИСАНИЕ

**Лот №1.** Капитальное строение (незавершенный не законсервированный строительством объект), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623685206101000064, площадью 0,1668 га, по адресу: Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, д. Острошицкий Городок, участок №92. Начальная цена продажи – 82 498,50 бел.руб. Задаток – 8 240,00 бел.руб.

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, обращенного в доход государства, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 17.03.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель - РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже кап. строения (Лот № 1), проводимом 17 марта 2017 г.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений и задатков – 15.03.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра объекта: Натиевская Ангелина Викторовна, тел.: (044) 529-28-15, (017) 223-69-30.
Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

**31 марта 2017 года**
состоится очередное отчетно-выборное собрание акционеров

### ОАО «Камволь».

Собрание пройдет по месту расположения Общества:
г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4-й этаж главного корпуса.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

*1. Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 г. и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.*

*2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2016 году.*

*3. Отчет о работе ревизионной комиссии в 2016 году.*

*4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.*

*5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2016 год.*

*6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2017 год и первый квартал 2018 года.*

*7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*

*8. Утверждение размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, тел. 223-14-20, 2-97.

Начало работы собрания – 10.00.

Регистрация участников собрания – с 9.30 до 10.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01.03.2017.

УНП 100074393

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает об открытом аукционе по продаже гаража, г. Минск, ул. Я.Мавра, 53/3-2

| Наименование | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №500/D-708041656. Наименование: гараж. Г.п. – 1984. Этажность – 1. Общая площадь – 79,9 кв. м. Фундамент – фунд. блоки. Стены наружные и внутренние – кирпичные. Перекрытия – ж/бетонные плиты. Крыша – мягкая рулонная. Полы – плитка, бетон. Проемы – ворота металлические. Внутренняя отделка – оштукатурено. Электроснабжение – есть | 38 250,00 | 3 820,00 |

Шаг аукциона – 5%

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 31.03.2017 в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (гараж) (Лот №1), проводимом 31.03.2017 (Фрунзенский МРО).

Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 6, в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 29.03.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Усович Александр Сергеевич, тел.: 8-017-219-06-84; +375-29-564-08-29

**☎ Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

## РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении 31 марта 2017 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Коминтерн» на праве собственности

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т.ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, рублей (в т.ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль ГАЗ 2705 435,** рег. знак АВ 7602-3, год выпуска – 2004, цвет красно-бордовый. Номер кузова (рамы): 27050040124710 ХТН27050040373500. Тип: грузо-пассажирский фургон. Вид топлива – бензин. Объем двигателя – 2460 см$^3$ | 1920,00 | 150,00 |

**Шаг аукциона – 5%.**

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6,** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 30 марта 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **31 марта 2017 г**.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

